ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

НЯДЗЕЛЯ, 12 САКАВІКА 1939 г. № 14 (428) ЦАНА 20 К.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

„...Няма неабходнасці, каб спецыяліст-медык быў разам з тым спецыялістам па фізіцы або батаніцы і наадварот. Але ёсць адна галіна навукі, веданне якой павінна быць абавязковым для большэвікоў усіх галін навукі,—гэта марксісцка-ленінская навука аб грамадстве, аб законах развіцця грамадства, аб законах развіцця пролетарскай рэволюцыі, аб законах развіцця соцыялістычнага будаўніцтва, перамозе комунізма“.

З даклада тав. СТАЛІНА на XVIII з'ездзе ВКП(б)

XVIII З'ЕЗД ВКП(б)

АДКРЫЦЦЁ З'ЕЗДА (10 сакавіка 1939 года)

5 гадзін 15 мінут вечара. Паяўленне на грыбуне таварышаў Сталіна, Молатава, Варашылава, Кагановіча, Калініна, Андрэева, Мікаяна, Жданава, Хрушчова сустракаецца громам апладысментаў, бурная авацыя, усе ўстаюць. З розных канцоў зала нясуцца воклічы на ўсіх мовах народаў СССР у часць вялікага Сталіна: **«Правадыру народаў — вялікаму Сталіну — ура!», «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Роднаму, любімаму Сталіну — ура!», «Няхай жыве Сталінскі Цэнтральны Камітэт!», «Няхай жыве наш правадыр і настаўнік — таварыш Сталін!», «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Няхай жыве першы маршал арміі комунізма таварыш Сталін!».**

Званкі старшынствуючага таварыша Молатава тонуць у неспыняючыхся, усё ўзмацняючыхся авацыях.

Уступная прамова таварыша В. М. МОЛАТАВА

Молатаў. Таварышы!

К гэтаму з'езду партыя прышла з перамогамі гістарычнай важнасці.

На месцы старой, адсталай нават у капіталістычных адносінах краіны створан новы лад, — соцыялізм у асноўным пабудован. Мы даўно прагналі памешчыкаў і капіталістаў, але канчаткова ачысцілі нашу зямлю ад усякіх эксплаататараў толькі ў апошнія годы. Створана новае грамадства, узброенае самай перадавой тэхнікай. Склалася соцыялістычная дзяржава рабочых і сялян, якая ідзе ўгару, ідзе да поўнай перамогі комунізма сваёю выпрабаванаю большэвіцкаю дарогай. І гэта ў той час, калі капіталізм шукае для сябе выратаванне ў фашызме, праклінаемым усімі прыхільнікамі чалавечаскага прагрэса, калі капіталізм, із'едзены крызісамі і паразітычным гніеннем на карню, усё больш упягвае Еўропу і Азію ў новую сусветную імперыялістычную вайну.

З радаснымі пачуццямі сустракаюць наш з'езд працоўныя Совецкага Саюза. Гэтыя пачуцці нам блізкі і зразумелы. Гэтыя пачуцці народжаны вялікімі баямі і склаўшымся ў нас маральна-палітычным адзінствам. Яны створаны вялікай дружбай народаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, згуртаваных у вялікую армію комунізма, гатовую да новых баёў пад сцягам Леніна—Сталіна. **(Апладысменты, усе ўстаюць).**

Мы закончылі яшчэ адзін гістарычны этап комуністычнай рэволюцыі ў СССР. Мы завяршылі ў асноўным цэлую эпоху будаўнічай работы, каб уступіць у новую эпоху, у эпоху паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма.

Наш вопыт, вопыт будаўнікоў комуністычнага грамадства, ужо поўнасцю паказаў, што магчымасці росту сіл СССР неабмежавана вялікія. Цяпер у нашай краіне зроблена ўсё для таго, каб крынічнай біла народная творчасць на велізарных прасторах многанацыянальнага Совецкага Саюза, каб з кожным днём рос народны добрабыт, разгортвалася ўшыр і ўглыб культурнае будаўніцтва краіны соцыялізма.

Разам з тым вопыт апошніх год паказаў, што ў нас была пэўная недаацэнка знешніх варожых сіл, была недаацэнка іх варожай актыўнасці і зваротлівасці ў барацьбе з СССР. Справа дайшла да таго, што нашы знешнія ворагі з лагера капіталізма замыслілі зрабіць свайго рода ўмяшанне ў нашы ўнутраныя справы. Гэта своеасаблівае ўмяшанне ў совецкія справы заключалася ў спробе некаторых імперыялістычных дзяржаў, і асабліва фашысцкіх, завезці і размясціць сваіх агентаў у органах дзяржаўнай улады СССР. Яны, уласна, захацелі прымяніць да Совецкага Саюза свой багаты вопыт у адносінах больш слабых буржуазных дзяржаў, дзе часам ва ўрадавых вярхах сядзяць і вырашаюць справы не хто-небудзь, а іменна платныя агенты і шпіёны буйных замежных дзяржаў. Як гэта ні нагла з іх боку, але і ў адносінах да Совецкага Саюза рабіліся такія-ж спробы праз людзей, якія ўчора яшчэ прыкрывалі сваё гнуснае вераломства і здраду комуністычным партыйным білетам. Так будзе і надалей, калі на лоўкасць і зваротлівасць замежных разведак мы не адкажам падвоенай і падзесяцяронай лоўкасцю і зваротлівасцю совецкай разведкі. **(Апладысменты).**

Вы ведаеце, проіскі знешняга класавага ворага з лагера капіталізма, асабліва, з лагера фашызма, намі разбіты ўпух і ўпрах. Іх новы шпіёнскі прыём умяшання, у якім усе гэтыя троцкія, рыкавы, бухарыны, зіноўевы, тухачэўскія, радэкі, ікрамавы, любчэнкі адыгралі жалкую ролю шпікаў—шкоднікаў і брудных агентаў замежных разведак, поўнасцю праваліўся.

Мы атрымалі новы ўрок па пытанню аб дзяржаве і новы багаты вопыт аб атручаных ядам вераломства прыёмах барацьбы з совецкай уладай. Мы адказалі на гэта рашучым большэвіцкім умацаваннем совецкай дзяржавы, Чырвонай Арміі і ўсіх іншых баявых органаў дзяржаўнай улады, роўна як узмацненнем барацьбы з фашызмам і фашысцкай агентурай. **(Апладысменты).**

Новая паласа ставіць перад намі новыя задачы.

З пункту гледжання нашых унутраных задач цэнтр цяжару пераносіцца цяпер на пытанні **выхаваўчыя,** на пытанні комуністычнага выхавання, на задачы ліквідацыі столь яшчэ жывучых перажыткаў капіталізма ў сазнанні працоўных.

Мы намячаем новыя планы ўздыму народнай гаспадаркі, новыя планы росту народнага добрабыту і ўсебаковага ўздыму культурнага ўзроўню працоўных.

Мы разгарнулі вялікую работу па ідэйнаму і арганізацыйнаму ўмацаванню партыі, па далейшаму ўзмацненню баявых якасцяў нашых партыйных арганізацый.

Каб па-сапраўднаму ўсвядоміць і з максімальнымі практычнымі рэзультатамі скарыстаць у інтарэсах народа нашы палітычныя, нашы эканамічныя, нашы культурныя, нашы арганізацыйныя і ўсе іншыя велізарныя магчымасці, нам больш за ўсё неабходна ў даны перыяд усямернае павышэнне справы комуністычнага выхавання. Каб яшчэ больш паспяхова рашаць любыя арганізацыйныя пытанні ўздыму магутнасці нашай дзяржавы, каб яшчэ быстрэй рухацца наперад у рашэнні асноўнай эканамічнай задачы Совецкага Саюза, у рашэнні задачы дагнаць і перагнаць у кароткі тэрмін найбольш развітыя капіталістычныя краіны таксама і ў эканамічных адносінах, — трэба высунуць наперад задачы выхавання мас у духу комуністычна-свядомых адносін да працы, задачы далейшага павышэння ідэйнага выхавання саміх кадраў партыйнага і дзяржаўнага апарата і ўсёй совецкай інтэлігенцыі ў духу марксізма-ленінізма, у духу большэвізма.

Гэты з'езд выкліча новы ўздым усёй нашай работы, новы ўздым справы комуністычнага выхавання і навукова-тэарэтычнай работы. Нашы з'езды заўсёды асвятлялі далёка ўперад назрэўшыя задачы партыі і заўсёды былі буйным этапам ва ўздыме комуністычнай свядомасці мас, у комуністычным выхаванні працоўных.

Ніякі вораг ужо не зможа зламаць наш Совецкі Саюз. Любы агрэсар разаб'е свой медны лоб аб совецкі пагранічны слуп. **(Бурныя апладысменты).**

Для каго мала нашых адкрытых папярэджанняў, той даведаецца аб гэтым у свой яму паложаны час. І тым пабеданоснеі, тым больш значнымі ў міжнародным сэнсе будуць нашы поспехі ў гэтай надыходзячай барацьбе з сіламі знешняй агрэсіі, чым больш і чым пладатворней мы папрацуем над комуністычным выхаваннем у нашай краіне.

Таварышы дэлегаты! Дазвольце выказаць упэўненасць, што XVIII з'езд і ў гэтых адносінах выканае сваю гістарычную ролю. Парукай гэтаму, што ў нашай краіне рабочы клас і ўся маса працоўных ідзе ўперад пад высока ўзнятым пабеданосным сцягам партыі Леніна — Сталіна. **(Усе ўстаюць, апладысменты).**

Парукай гэтаму, што нашу партыю вядзе ўперад вялікі арганізатар слаўных перамог комунізма, вялікі натхніцель комуністычнага выхавання мас — наш Сталін. **(Усе ўстаюць, апладысменты. Воклічы «Ура». Голас з месца: «Няхай жыве таварыш Сталін!»).**

Таварышы, на з'езд выбраны 1.574 дэлегаты з рашаючым голасам, прыбыло— 1.567 дэлегатаў. З прычыны гэтага дазвольце мне, па даручэнню Цэнтральнага Камітэта партыі, аб'явіць XVIII партыйны з'езд адкрытым.

* *

Апошнія словы таварыша Молатава пакрываюцца бурнымі апладысментамі. З'езд, стоячы, вітае таварыша Молатава. Па ўсяму залу раздаюцца воклічы: «Няхай жыве вялікая партыя Леніна—Сталіна!», «Ура роднаму і любімаму Сталіну!», «Няхай жыве правадыр народаў таварыш Сталін!», «Вялікаму натхніцелю і арганізатару слаўных перамог комунізма таварышу Сталіну — ура!».

З'езд пераходзіць да выбараў кіруючых органаў з'езда. Аднагалосна выбіраецца прэзідыум з'езда, сакратарыят, рэдакцыйная камісія і мандатная камісія.

КІРУЮЧЫЯ ОРГАНЫ З'ЕЗДА

ПРЭЗІДЫУМ

АНДРЭЕЎ А. А.
БАГІРАЎ М. А.
БЕРЫЯ Л. П.
БУДЗЁННЫЙ С. М.
БУРМІСТЭНКО М. А.
ВАРАШЫЛАЎ К. Е.
ДВІНСКІ Б. А.
ДАНСКОЙ В. А.
ЖДАНАЎ А. А.
КАГАНОВІЧ Л. М.
КАЛІНІН М. І.
КАРОТЧЭНКО Д. С.
КУЗНЕЦОЎ А. А. — Ленінград
КУЗНЕЦОЎ Н. Г. — Прымор'е
ЛАКЦІОНАЎ А. Д.
МАЛЕНКОЎ Г. М.
МАНУІЛЬСКІ Д. З.
МЕХЛІС Л. З.
МІКАЯН А. І.
МІХАЙЛАЎ Н. А.
МОЛАТАЎ В. М.
НІКАЛАЕВА К. І.
ПАНАМАРЭНКА П. К.
СЕДЗІН І. К.
СКВАРЦОЎ Н. А.
СТАЛІН І. В.
ТІМАШЭНКО С. К.
ХРУШЧОЎ Н. С.
ШАХУРЫН А. І.
ШВЕРНІК Н. М.
ШКІРАТАЎ М. Ф.
ШТЭРН Г. М.
ШЧЭРБАКОЎ А. С.
ЮСУПАЎ У.
ЯРАСЛАЎСКІ Ем.

САКРАТАРЫЯТ

ПАСКРЭБЫШЭЎ А. Н.
ШЧАДЭНКА Е. А.
МІШАКОВА О. П.
ПЕГАЎ Н. М.
ПАПОЎ Г. М.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАМІСІЯ

МЕХЛІС Л. З.
ПАСПЕЛАЎ П. Н.
ГОРКІН А. Ф.
МІЦІН М. Б.
РАВІНСКІ Л. Я.

МАНДАТНАЯ КАМІСІЯ

АЛЕМАСАЎ А. М.
АНДРЫАНАЎ В. М.
АНТОНАЎ Д. І.
АРУЦІНАЎ Г. А.
БАЙЦОЎ І. П.
БАРКОЎ Г. А.
ВАГАЎ А. В.
ВЛАСАЎ І. А.
ДАРОНІН П. І.
ДУБРОЎСКІ А. А.
ЖАВАРАНКАЎ В. Г.
ЗАДЗІОНЧЭНКО С. Б.
ІГНАТАЎ Н. Г.
КАЧАЛІН К. І.
КВАСАЎ М. Е.
ЛЮБАВІН П. М.
МАЛЕНКОЎ Г. М.
МУРУГАЎ І. В.
НІКІЦІН В. Д.
ПРАТАПОПАЎ Д. З.
РАСЦЕГІН Г. С.
СЕЛЕЗНЁЎ П. І.
СЕРДЗЮК З. Т.
ФРАЛКОЎ А. А.
ЧАРКВІАНІ К. Н.
ЧУБІН Я. А.
ЧУЯНАЎ А. С.
ШКІРАТАЎ М. Ф.
ШТЫКОЎ Т. Ф.

* * *

Пасля выбараў кіруючых органаў з'езд зацвярджае парадак дня і рэгламент з'езда.

Старшынствуючы таварыш Молатаў **прадастаўляе слова для даклада па першаму пункту парадку дня з'езда таварышу Сталіну.**

Бурнай авацыяй, стоячы, з'езд сустракае таварыша Сталіна. На ўсіх мовах народаў вялікага Совецкага Саюза раздаюцца воклічы: «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Ура!», «Правадыру, настаўніку і другу таварышу Сталіну — ура!», «Няхай жыве наш родны, любімы Сталін!».

Доўга працягваецца авацыя — выражэнне бязмежнай любві ўсёй партыі да свайго правадыра. Званок старшыні тоне ў буры апладысментаў, прывітанняў з'езда.

Таварыш Сталін пачынае справаздачны даклад аб рабоце ЦК ВКП(б).

СПРАВАЗДАЧНЫ ДАКЛАД ТАВАРЫША СТАЛІНА

НА XVIII З'ЕЗДЗЕ ПАРТЫІ АБ РАБОЦЕ ЦК ВКП(б)



I.

МІЖНАРОДНАЕ СТАНОВІШЧА СОВЕЦКАГА САЮЗА

Таварышы! З часу XVII з'езда партыі прайшло пяць год. Перыяд, як бачыце, не малы. За гэты час свет паспеў перажыць значныя змяненні. Дзяржавы і краіны, іх адносіны паміж сабой сталі ва многім зусім іншымі.

Якія іменна змяненні адбыліся за гэты перыяд у міжнароднай абстаноўцы? Што іменна змянілася ў знешнім і ўнутраным становішчы нашай краіны?

Для капіталістычных краін гэты перыяд быў перыядам сур'ёзнейшых патрасенняў як у галіне эканомікі, так і ў галіне палітыкі. У галіне эканамічнай гэтыя годы былі гадамі дэпрэсіі, а потым, пачынаючы з другой палавіны 1937 года, — гадамі новага эканамічнага крызіса, гадамі новага заняпаду прамысловасці ў ЗША, Англіі, Францыі, — значыцца, гадамі новых эканамічных ускладненняў. У галіне палітычнай гэтыя годы былі гадамі сур'ёзных палітычных канфліктаў і патрасенняў. Ужо другі год ідзе новая імперыялістычная вайна, якая разыгралася на велізарнай тэрыторыі ад Шанхая да Гібралтара і захваціла больш 500 мільёнаў насельніцтва. Насільствена перакройваецца карта Еўропы, Афрыкі, Азіі. Патрасена ў корані ўся сістэма пасляваеннага так званага мірнага рэжыма.

Для Совецкага Саюза, наадварот, гэтыя годы былі гадамі яго росту і працвітання, гадамі далейшага яго эканамічнага і культурнага ўздыму, гадамі далейшага росту яго палітычнай і ваеннай магутнасці, гадамі яго барацьбы за захаванне міру ва ўсім свеце.

Такава агульная карціна.

Разгледзім канкрэтныя даныя аб змяненнях у міжнароднай абстаноўцы.

1. Новы эканамічны крызіс у капіталістычных краінах. Абвастрэнне барацьбы за рынкі збыту, за крыніцы сыравіны, за новы перадзел свету

Эканамічны крызіс, які пачаўся ў капіталістычных краінах у другой палавіне 1929 года, прадаўжаўся да канца 1933 года. Пасля гэтага крызіс перайшоў у дэпрэсію, а потым пачалося некаторае ажыўленне прамысловасці, некаторы яе ўздым. Але гэтае ажыўленне прамысловасці не перайшло ў працвітанне, як гэта бывае звычайна ў перыяд ажыўлення. Наадварот, пачынаючы з другой палавіны 1937 года, пачаўся новы эканамічны крызіс, які захваціў перш за ўсё ЗША, а ўслед за імі — Англію, Францыю і рад іншых краін.

Такім чынам, не паспеўшы яшчэ аправіцца ад удараў нядаўняга эканамічнага крызіса, капіталістычныя краіны апынуліся перад тварам новага эканамічнага крызіса.

Гэтая акалічнасць натуральна прывяла да ўзмацнення беспрацоўя. Лік беспрацоўных у капіталістычных краінах, які ўпаў было з 30 мільёнаў чалавек у 1933 годзе да 14 мільёнаў у 1937 годзе, цяпер зноў падняўся ў рэзультаце новага крызіса да 18 мільёнаў чалавек.

Характэрная асаблівасць новага крызіса заключаецца ў тым, што ён ва многім адрозніваецца ад папярэдняга крызіса, прычым адрозніваецца не ў лепшы бок, а ў горшы.

Па-першае, новы крызіс пачаўся не пасля працвітання прамысловасці, як гэта мела месца ў 1929 годзе, а пасля дэпрэсіі і некаторага ажыўлення, якое, аднак, не перайшло ў працвітанне. Гэта азначае, што цяперашні крызіс будзе больш цяжкім і з ім будзе трудней змагацца, чым з папярэднім крызісам.

Далей, цяперашні крызіс разыграўся не ў мірны час, а ў перыяд пачаўшайся ўжо другой імперыялістычнай вайны, калі Японія, ваюючы ўжо другі год з Кітаем, дэзарганізуе неабсяжны кітайскі рынак і робіць яго амаль недаступным для тавараў іншых краін, калі Італія і Германія перавялі ўжо сваю народную гаспадарку на рэльсы ваеннай эканомікі, ухлопаўшы на гэтую справу свае запасы сыравіны і валюты, калі ўсе астатнія буйныя капіталістычныя дзяржавы пачынаюць перастрайвацца на ваенны лад. Гэта азначае, што ў капіталізма рэсурсаў для нармальнага выхаду з цяперашняга крызіса будзе значна менш, чым у перыяд папярэдняга крызіса.

Нарэшце, у адрозненне ад папярэдняга крызіса, цяперашні крызіс з'яўляецца не ўсеагульным, а захватвае, пакуль што, галоўным чынам эканамічна магутныя краіны, не перайшоўшыя яшчэ на рэльсы ваеннай эканомікі. Што датычыць краін агрэсіўных накшталт Японіі, Германіі і Італіі, перабудаваўшых ужо сваю эканоміку на ваенны лад, то яны, узмоцнена развіваючы сваю ваенную прамысловасць, не перажываюць яшчэ стану крызіса перавытворчасці, хоць і набліжаюцца да яго. Гэта азначае, што ў той час як эканамічна магутныя, не агрэсіўныя краіны пачнуць вылазаць з паласы крызіса, агрэсіўныя краіны, вычарпаўшы свае залатыя і сыравінныя запасы ў ходзе ваеннай гарачкі, павінны будуць уступіць у паласу самага жорсткага крызіса.

(Працяг даклада на 2-й стар.).

Працяг справаздачнага даклада таварыша СТАЛІНА

Гэта наглядна ілюстрыруецца хоць-бы данымі аб наяўнасці відзімых залатых запасаў у капіталістычных краінах.

Відзімыя залатыя запасы ў капіталістычных краінах

(У млн. старых залатых долараў)

	Канец 1936 г.	Верасень 1938 г.
Усяго	12.980	14.301
ЗША	6.649	8.126
Англія	2.029	2.396
Францыя	1.769	1.435
Галандыя	289	595
Бельгія	373	318
Швейцарыя	387	407
Германія	16	17
Італія	123	124
Японія	273	97

З гэтай табліцы відаць, што залатыя запасы Германіі, Італіі і Японіі, разам узятых, прадстаўляюць меншую суму, чым запасы адной толькі Швейцарыі.

Вось некаторыя цыфравыя даныя, якія ілюстрыруюць крызіснае становішча прамысловасці капіталістычных краін за апошнія пяць год і рух прамысловага ўздыму ў СССР.

АБ'ЁМ ПРАМЫСЛОВАЙ ПРАДУКЦЫІ У ПРОЦАНТАХ К 1929 ГОДУ

(1929=100)

	1934	1935	1936	1937	1938
ЗША	66,4	75,6	88,1	92,2	72,0
Англія	98,8	105,8	115,9	123,7	112,0
Францыя	71,0	67,4	79,3	82,8	70,0
Італія	80,0	93,8	87,5	99,6	96,0
Германія	79,8	94,0	106,3	117,2	125,0
Японія	128,7	141,8	151,1	170,8	165,0
СССР	238,3	293,4	382,3	424,0	477,0

З гэтай табліцы відаць, што Совецкі Саюз з'яўляецца адзінай краінай у свеце, якая не ведае крызісаў і прамысловасць якой увесь час ідзе ўверх.

З гэтай табліцы відаць, далей, што ў ЗША, Англіі і Францыі пачаўся ўжо і развіваецца сур'ёзны эканамічны крызіс.

З гэтай табліцы відаць, далей, што ў Італіі і Японіі, якія раней Германіі перавялі сваю народную гаспадарку на рэльсы ваеннай эканомікі, пачаўся ўжо ў 1938 годзе перыяд руху прамысловасці ўніз.

З гэтай табліцы відаць, нарэшце, што ў Германіі, якая пазней Італіі і Японіі перабудавала сваю эканоміку на ваенны лад, прамысловасць пакуль яшчэ перажывае стан некаторага, праўда, невялікага, але ўсё-ж руху ўверх, — адпаведна з тым, як гэта мела месца да апошняга часу ў Японіі і Італіі.

Не можа быць сумнення, што, калі не здарыцца чаго-небудзь непрадбачанага, прамысловасць Германіі павінна будзе стаць на той-жа шлях руху ўніз, на які ўжо сталі Японія і Італія. Бо што значыць перавесці гаспадарку краіны на рэльсы ваеннай эканомікі? Гэта значыць даць прамысловасці аднабокі, ваенны напрамак, усямерна расшырыць вытворчасць неабходных для вайны прадметаў, не звязаную са спажываннем насельніцтва, усямерна звузіць вытворчасць і асабліва выпуск на рынак прадметаў спажывання насельніцтва,—значыцца, скараціць спажыванне насельніцтва і паставіць краіну перад эканамічным крызісам.

Такава канкрэтная карціна руху новага эканамічнага крызіса ў капіталістычных краінах.

Зразумела, што такі неспрыяльны абарот гаспадарчых спраў не мог не прывесці да абвастрэння адносін паміж дзяржавамі. Ужо папярэдні крызіс пераблытаў усе карты і прывёў да абвастрэння барацьбы з-за рынкаў збыту, з-за крыніц сыравіны. Захват Японіяй Манчжурыі і Паўночнага Кітая, захват Італіяй Абісініі, — усё гэта адлюстравала вастрыню барацьбы паміж дзяржавамі. Новы эканамічны крызіс павінен прывесці і сапраўды прыводзіць да далейшага абвастрэння імперыялістычнай барацьбы. Гутарка ідзе ўжо не аб канкурэнцыі на рынках, не аб гандлёвай вайне, не аб дэмпінгу. Гэтыя сродкі барацьбы даўно ўжо прызнаны недастатковымі. Гутарка ідзе цяпер аб новым перадзеле свету, сфер уплываў, калоній шляхам ваенных дзеянняў.

Японія стала апраўдваць свае агрэсіўныя дзеянні тым, што пры заключэнні дагавора 9-ці дзяржаў яе абдзялілі і не далі расшырыць сваю тэрыторыю за кошт Кітая, тады як Англія і Францыя ўладаюць велізарнымі калоніямі. Італія ўспомніла, што яе абдзялілі пры дзелябы здабычы пасля першай імперыялістычнай вайны і што яна павінна вазмясціць сябе за кошт сфер уплыву Англіі і Францыі. Германія, якая сур'ёзна пацярпела ў рэзультаце першай імперыялістычнай вайны і версальскага міру, далучылася да Японіі і Італіі і патрабавала расшырэння сваёй тэрыторыі ў Еўропе, звароту калоній, адабраных у яе пераможцамі ў першай імперыялістычнай вайне.

Так стаў складвацца блок трох агрэсіўных дзяржаў.

На чарзе ўстала пытанне аб новым перадзеле свету шляхам вайны.

2. Абвастрэнне міжнароднага палітычнага становішча, крушэнне пасляваеннай сістэмы мірных дагавораў, пачатак новай імперыялістычнай вайны

Вось пералік важнейшых падзей за справаздачны перыяд, паклаўшых пачатак новай імперыялістычнай вайне. У 1935 годзе Італія напала на Абісінію і захваціла яе. Летам 1936 года Германія і Італія арганізавалі ваенную інтэрвенцыю ў Іспаніі, прычым Германія ўцвярдзілася на поўначы Іспаніі і ў Іспанскім Мароко, а Італія — на поўдні Іспаніі і на Балеарскіх астравах. У 1937 годзе Японія, пасля захвату Манчжурыі, уторглася ў Паўночны і Цэнтральны Кітай, заняла Пекін, Цяньцзін, Шанхай і стала выцясняць з зоны акупацыі сваіх іншакраінных канкурэнтаў.

У пачатку 1938 года Германія захваціла Аўстрыю, а восенню 1938 года — Судэцкую вобласць Чэхаславакіі. У канцы 1938 года Японія захваціла Кантон, а ў пачатку 1939 г.— востраў Хайнань.

Такім чынам, вайна, якая так непрыкметна падкралася да народаў, уцягнула ў сваю арбіту звыш пяцісот мільёнаў насельніцтва, пашырыўшы сферу свайго дзеяння на велізарную тэрыторыю, ад Цяньцзіна, Шанхая і Кантона праз Абісінію да Гібралтара.

Пасля першай імперыялістычнай вайны дзяржавы-пераможцы, галоўным чынам Англія, Францыя і ЗША, стварылі новы рэжым адносін паміж краінамі, пасляваенны рэжым міру. Галоўнымі асновамі гэтага рэжыма былі на Далёкім Усходзе — дагавор дзевяці дзяржаў, а ў Еўропе — версальскі і цэлы рад іншых дагавораў. Ліга нацый заклікана была рэгуляваць адносіны паміж краінамі ў рамках гэтага рэжыма на аснове адзінага фронта дзяржаў, на аснове калектыўнай абароны бяспечнасці дзяржаў. Аднак тры агрэсіўныя дзяржавы і пачатая імі новая імперыялістычная вайна апракінулі ўверх дном усю гэтую сістэму пасляваеннага мірнага рэжыма. Японія разарвала дагавор дзевяці дзяржаў, Германія і Італія — версальскі дагавор. Каб аслабаніць сабе рукі, усе гэтыя тры дзяржавы вышлі з Лігі нацый.

Новая імперыялістычная вайна стала фактам.

У наш час не так-то лёгка сарвацца адразу з ланцуга і рынуцца прама ў вайну, не лічачыся з рознага рода дагаворамі, не лічачыся з грамадскай думкай. Буржуазным палітыкам вядома гэта дастаткова добра. Вядома гэта таксама фашысцкім заправілам. Таму фашысцкія заправілы, раней чым рынуцца ў вайну, рашылі пэўным чынам апрацаваць грамадскую думку, г. зн. увесці яе ў заблуджэнне, абмануць яе.

Ваенны блок Германіі і Італіі супроць інтарэсаў Англіі і Францыі ў Еўропе? Памілуйце, які-ж гэта блок! «У нас» няма ніякага ваеннага блока. «У нас» усяго-на-ўсяго бяскрыўдная «ось Берлін—Рым», г. зн. некаторая геаметрычная формула наконт асі. **(Смех).**

Ваенны блок Германіі, Італіі і Японіі супроць інтарэсаў ЗША, Англіі і Францыі на Далёкім Усходзе? Нічога падобнага! «У нас» няма ніякага ваеннага блока. «У нас» усяго-на-ўсяго бяскрыўдны «трохвугольнік Берлін—Рым—Токіо», г. зн. маленькае захапленне геаметрыяй. **(Агульны смех).**

Вайна супроць інтарэсаў Англіі, Францыі, ЗША? Глупства! «Мы» вядзем вайну супроць Комінтэрна, а не супроць гэтых дзяржаў. Калі не верыце, чытайце «антыкомінтэрнаўскі пакт», заключаны паміж Італіяй, Германіяй і Японіяй.

Так думалі апрацаваць грамадскую думку паны агрэсары, хоць не трудна было зразумець, што ўся гэтая нязграбная ігра ў маскіроўку шыта белымі ніткамі, бо смешна шукаць «ачагі» Комінтэрна ў пустынях Манголіі, у гарах Абісініі, у дзебрах Іспанскага Мароко. **(Смех).**

Але вайна няўмольна. Яе нельга скрыць ніякімі пакровамі. Бо ніякімі «осямі», «трохвугольнікамі» і «антыкомінтэрнаўскімі пактамі» немагчыма скрыць той факт, што Японія захваціла за гэты час велізарную тэрыторыю Кітая, Італія — Абісінію, Германія — Аўстрыю і Судэцкую вобласць, Германія і Італія разам — Іспанію, усё гэта наперакор інтарэсам неагрэсіўных дзяржаў. Вайна так і асталася вайной, ваенны блок агрэсараў — ваенным блокам, а агрэсары — агрэсарамі.

Характэрная рыса новай імперыялістычнай вайны заключаецца ў тым, што яна не стала яшчэ ўсеагульнай, сусветнай вайной. Вайну вядуць дзяржавы-агрэсары, усяляк ушчамляючы інтарэсы неагрэсіўных дзяржаў, перш за ўсё Англіі, Францыі, ЗША, а апошнія пяцяцца назад і адступаюць, даючы агрэсарам уступку за ўступкай.

Такім чынам, на нашых вачах адбываецца адкрыты перадзел свету і сфер уплыву за кошт інтарэсаў неагрэсіўных дзяржаў без якіх-небудзь спроб адпору і нават пры некаторым патуранні з боку апошніх.

Неймаверна, але факт.

Чым аб'ясніць такі аднабокі і дзіўны характар новай імперыялістычнай вайны?

Як магло здарыцца, што неагрэсіўныя краіны, якія маюць велізарныя магчымасці, так лёгка і без адпору адмовіліся ад сваіх пазіцый і сваіх абавязацельстваў ва ўгоду агрэсарам?

Ці не аб'ясняецца гэта слабасцю неагрэсіўных дзяржаў? Вядома, не! Неагрэсіўныя, дэмакратычныя дзяржавы, узятыя разам, бясспрэчна сільней фашысцкіх дзяржаў і ў эканамічных і ў ваенных адносінах.

Чым-жа аб'ясніць у такім выпадку сістэматычныя ўступкі гэтых дзяржаў агрэсарам?

Гэта можна было-б аб'ясніць, напрыклад, пачуццём боязні перад рэвалюцыяй, якая можа разыграцца, калі неагрэсіўныя дзяржавы ўступяць у вайну, і вайна прыме сусветны характар. Буржуазныя палітыкі, зразумела, ведаюць, што першая сусветная імперыялістычная вайна дала перамогу рэвалюцыі ў адной з самых вялікіх краін. Яны баяцца, што другая сусветная імперыялістычная вайна можа павесці таксама да перамогі рэвалюцыі ў адной або ў некалькіх краінах.

Але гэта зараз не адзіная і нават не галоўная прычына. Галоўная прычына заключаецца ў адмове большасці неагрэсіўных краін і, перш за ўсё, Англіі і Францыі ад палітыкі калектыўнай бяспечнасці, ад палітыкі калектыўнага адпору агрэсарам, у пераходзе іх на пазіцыю неўмяшання, на пазіцыю «нейтралітэта».

Фармальна палітыку неўмяшання можна было-б ахарактарызаваць такім чынам: «Няхай кожная краіна абараняецца ад агрэсараў, як хоча і як можа, наша справа старана, мы будзем гандляваць і з агрэсарамі і з іх афярамі». На справе, аднак, палітыка неўмяшання азначае патуранне агрэсіі, развязванне вайны, — значыцца, ператварэнне яе ў сусветную вайну. У палітыцы неўмяшання сквозіць імкненне, жаданне — не перашкаджаць агрэсарам тварыць сваю чорную справу, не перашкаджаць, скажам, Японіі ўпутацца ў вайну з Кітаем, а яшчэ лепш з Совецкім Саюзам, не перашкаджаць, скажам, Германіі ўвязнуць у еўрапейскіх справах, упутацца ў вайну з Совецкім Саюзам, даць усім удзельнікам вайны ўвязнуць глыбока ў ціну вайны, заахвочваць іх у гэтым цішком, даць ім аслабіць і знясіліць адзін другога, а потым, калі яны дастаткова аслабнуць, — выступіць на сцэну са свежымі сіламі, выступіць, вядома, «у інтарэсах міру», і прадыктаваць аслабеўшым удзельнікам вайны свае ўмовы.

І дзёшава і міла!

Узяць, напрыклад, Японію. Характэрна, што перад пачаткам утаржэння Японіі ў Паўночны Кітай усе ўплывовыя французскія і англійскія газеты грамагласна крычалі аб слабасці Кітая, аб яго няздольнасці супраціўляцца, аб тым, што Японія з яе арміяй магла-б у два-тры месяцы пакарыць Кітай. Потым еўрапейска-амерыканскія палітыкі сталі чакаць і назіраць. А потым, калі Японія разгарнула ваенныя дзеянні, уступілі ёй Шанхай, сэрца іншакраіннага капітала ў Кітаі, уступілі Кантон, ачаг манапольнага англійскага ўплыву ў Паўднёвым Кітаі, уступілі Хайнань, далі акружыць Ганконг. Ці не праўда, усё гэта вельмі падобна на заахвочванне агрэсара: моў, улязай далей у вайну, а там паглядзім.

Або, напрыклад, узяць Германію. Уступілі ёй Аўстрыю, не гледзячы на наяўнасць абавязацельства абараняць яе самастойнасць, уступілі Судэцкую вобласць, кінулі на волю лёсу Чэхаславакію, парушыўшы ўсе і ўсякія абавязацельствы, а потым сталі крыкліва хлусіць у друку аб «слабасці рускай арміі», аб «разлажэнні рускай авіяцыі», аб «беспарадках» у Совецкім Саюзе, штурхаючы немцаў далей на ўсход, абяцаючы ім лёгкую здабычу і прыгаварваючы: вы толькі пачніце вайну з бальшавікамі, а далей усё пойдзе добра. Трэба прызнаць, што гэта таксама вельмі падобна на падштурхоўванне, на заахвочванне агрэсара.

Характэрны шум, які падняла англа-французская і паўночна-амерыканская прэса па поваду Совецкай Украіны. Дзеячы гэтай прэсы да хрыпаты крычалі, што немцы ідуць на Совецкую Украіну, што яны маюць цяпер у руках так званую Карпацкую Украіну, якая налічвае каля 700 тысяч насельніцтва, што немцы не далей, як вясной гэтага года далучаць Совецкую Украіну, якая мае больш 30 мільёнаў насельніцтва, да так званай Карпацкай Украіны. Падобна на тое, што гэты падазроны шум меў сваёй мэтай падняць ярасць Совецкага Саюза супроць Германіі, атруціць атмасферу і справацыраваць канфлікт з Германіяй без відзімых на тое падстаў.

Вядома, зусім магчыма, што ў Германіі ёсць вар'яты, якія мараць далучыць слана, г. зн. Совецкую Украіну, да казяўкі, г. зн. да так званай Карпацкай Украіны. І калі сапраўды ёсць там такія сумазброды, можна не сумнявацца, што ў нашай краіне знойдзецца неабходная колькасць смірыцельных кашуль для такіх вар'ятаў. **(Узрыў апладысментаў).** Але калі адкінуць прэч вар'ятаў і звярнуцца да нармальных людзей, то хіба не ясна, што смешна і глупа гаварыць сур'ёзна аб далучэнні Совецкай Украіны да так званай Карпацкай Украіны? Падумайце толькі. Прышла казяўка да слана і гаворыць яму, падбачэніўшыся: «Эх ты, брацец ты мой, да чаго мне цябе шкада... Жывеш ты без памешчыкаў, без капіталістаў, без нацыянальнага гнёту, без фашысцкіх заправіл, — якое-ж гэта жыццё... Гляджу я на цябе і не магу не заўважыць, — няма табе выратавання, апрача як далучыцца да мяне... **(Агульны смех).** Ну што-ж, так і быць, дазваляю табе далучыць сваю невялікую тэрыторыю да маёй неабсяжнай тэрыторыі»... **(Агульны смех і апладысменты).**

Яшчэ больш характэрна, што некаторыя палітыкі і дзеячы прэсы Еўропы і ЗША, страціўшы цярпенне ў чаканні «паходу на Совецкую Украіну», самі пачынаюць выкрываць сапраўдную падаплёку палітыкі неўмяшання. Яны прама гавораць і пішуць чорным па беламу, што немцы жорстка іх «расчаравалі», бо, замест таго, каб рушыць далей на ўсход, супроць Совецкага Саюза, яны, бачыце, павярнулі на захад і патрабуюць сабе калоній. Можна падумаць, што немцам аддалі раёны Чэхаславакіі, як цану за абавязацельства пачаць вайну з Совецкім Саюзам, а немцы адмаўляюцца цяпер плаціць па вэкселю, пасылаючы іх кудысьці падальш.

Я далёкі ад таго, каб маралізіраваць па поваду палітыкі неўмяшання, гаварыць аб здрадзе, аб прадацельстве і т. п. Наіўна чытаць мараль людзям, якія не прызнаюць чалавечай маралі. Палітыка ёсць палітыка, як гавораць старыя, прапжоныя буржуазныя дыпламаты. Неабходна, аднак, заўважыць, што вялікая і небяспечная палітычная ігра, пачатая сторнікамі палітыкі неўмяшання, можа скончыцца для іх сур'ёзным правалам.

Такі сапраўдны твар пануючай цяпер палітыкі неўмяшання.

Такая палітычная абстаноўка ў капіталістычных краінах.

3. Совецкі Саюз і капіталістычныя краіны

Вайна стварыла новую абстаноўку ў адносінах паміж краінамі. Яна ўнесла ў гэтыя адносіны атмасферу трывогі і няўпэўненасці. Падарваўшы асновы пасляваеннага мірнага рэжыма і апракінуўшы элементарныя паняцці міжнароднага права, вайна паставіла пад пытанне каштоўнасць міжнародных дагавораў і абавязацельстваў. Пацыфізм і праекты раззбраення аказаліся пахаванымі ў труну. Іх месца заняла ліхарадка ўзбраення. Сталі ўзбройвацца ўсе, ад малых да вялікіх дзяржаў, у тым ліку і перш за ўсё дзяржавы, якія праводзяць палітыку неўмяшання. Ніхто ўжо не верыць у елейныя прамовы аб тым, што мюнхенскія ўступкі агрэсарам і мюнхенскае пагадненне паклалі, быццам-бы, пачатак новай эры «ўміратварэння». Не вераць у іх таксама самі ўдзельнікі мюнхенскага пагаднення. Англія і Францыя, якія не менш другіх сталі ўзмацняць сваё ўзбраенне.

Зразумела, што СССР не мог прайсці міма гэтых грозных падзей. Несумненна, што ўсякая нават невялікая вайна, пачатая агрэсарамі дзе-небудзь у аддаленым кутку свету, прадстаўляе небяспеку для міралюбівых краін. Тым больш сур'ёзную небяспеку прадстаўляе новая імперыялістычная вайна, паспеўшая ўжо ўцягнуць у сваю арбіту больш пяцісот мільёнаў насельніцтва Азіі, Афрыкі, Еўропы. З прычыны гэтага наша краіна, няўхільна праводзячы палітыку захавання міру, разгарнула разам з тым сур'ёзнейшую работу па ўзмацненню баявой гатоўнасці нашай Чырвонай Арміі, нашага Чырвонага Ваенна-Марскога Флота.

Разам з тым у інтарэсах умацавання сваіх міжнародных пазіцый Совецкі Саюз рашыў прадпрыняць і некаторыя іншыя крокі. У канцы 1934 года наша краіна ўступіла ў Лігу нацый, выходзячы з таго, што, не гледзячы на яе слабасць, яна ўсё-ж можа прыгадзіцца, як месца выкрыцця агрэсараў і як некаторы, хоць і слабы, інструмент міру, які можа тармазіць развязванне вайны. Совецкі Саюз лічыць, што ў такі трывожны час не трэба пагарджаць нават такой слабай міжнароднай арганізацыяй, як Ліга нацый. У маі 1935 г. быў заключан дагавор паміж Францыяй і Совецкім Саюзам аб узаемнай дапамозе супроць магчымага нападу агрэсараў. Адначасова з гэтым быў заключан аналагічны дагавор з Чэхаславакіяй. У сакавіку 1936 г. Совецкі Саюз заключыў дагавор з Мангольскай Народнай Рэспублікай аб узаемнай дапамозе. У жніўні 1937 г. быў заключан дагавор аб узаемным ненападзе паміж Совецкім Саюзам і Кітайскай рэспублікай.

У гэтых трудных міжнародных умовах праводзіў Совецкі Саюз сваю знешнюю палітыку, адстойваючы справу захавання міру.

Знешняя палітыка Совецкага Саюза ясна і зразумела:

1. Мы стаім за мір і ўмацаванне дзелавых сувязей з усімі краінамі, стаім і будзем стаяць на гэтай пазіцыі, паколькі гэтыя краіны будуць трымацца такіх-жа адносін з Совецкім Саюзам, паколькі яны не папрабуюць парушыць інтарэсы нашай краіны.

2. Мы стаім за мірныя, блізкія і добрасуседскія адносіны з усімі суседнімі краінамі, маючымі з СССР агульную граніцу, стаім і будзем стаяць на гэтай пазіцыі, паколькі гэтыя краіны будуць трымацца такіх-жа адносін з Совецкім Саюзам, паколькі яны не папрабуюць парушыць, прама ці ўскосна, інтарэсы цэласці і недатыкальнасці граніц Совецкай дзяржавы.

3. Мы стаім за падтрыманне народаў, якія сталі афярамі агрэсіі і змагаюцца за незалежнасць сваёй радзімы.

4. Мы не баімся пагроз з боку агрэсараў і гатовы адказаць двайным ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны, якія прабуюць парушыць недатыкальнасць совецкіх граніц.

Такая знешняя палітыка Совецкага Саюза. **(Бурныя працяглыя апладысменты).**

У сваёй знешняй палітыцы Совецкі Саюз апіраецца:

1. На сваю растучую гаспадарчую, палітычную і культурную магутнасць;

2 На маральна-палітычнае адзінства нашага совецкага грамадства;

3. На дружбу народаў нашай краіны;

4. На сваю Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Чырвоны Флот;

5. На сваю мірную палітыку;

6. На маральнае падтрыманне працоўных усіх краін, кроўна зацікаўленых у захаванні міру;

7. На разважлівасць тых краін, якія не зацікаўлены па тых ці іншых прычынах у парушэнні міру.

* *

Задачы партыі ў галіне знешняй палітыкі:

1. Праводзіць і надалей палітыку міру і ўмацавання дзелавых сувязей з усімі краінамі;

2. Захоўваць асцярожнасць і не даваць уцягнуць у канфлікты нашу краіну правакатарам вайны, якія прывыклі заграбаць жар чужымі рукамі;

3. Усямерна ўмацоўваць баявую магутнасць нашай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Чырвонага Флота;

4. Мацаваць міжнародныя сувязі дружбы з працоўнымі ўсіх краін, зацікаўленымі ў міры і дружбе паміж народамі.

II. УНУТРАНАЕ СТАНОВІШЧА СОВЕЦКАГА САЮЗА

Пяройдзем да ўнутранага становішча нашай краіны.

З пункту гледжання ўнутранага становішча Совецкага Саюза справаздачны перыяд прадстаўляе карціну далейшага ўздыму ўсёй народнай гаспадаркі, росту культуры, умацавання палітычнай магутнасці краіны.

Найбольш важным рэзультатам у галіне развіцця народнай гаспадаркі за справаздачны перыяд трэба прызнаць завяршэнне рэканструкцыі прамысловасці і земляробства на аснове новай, сучаснай тэхнікі. У нас няма ўжо больш, або амаль няма больш старых заводаў з іх адсталай тэхнікай і старых сялянскіх гаспадарак з іх дапатопным абсталяваннем. Аснову нашай прамысловасці і земляробства складае цяпер новая, сучасная тэхніка. Можна сказаць без пераўвелічэння, што з пункту гледжання тэхнікі вытворчасці, з пункту гледжання насычанасці прамысловасці і земляробства новай тэхнікай, наша краіна з'яўляецца найбольш перадавой у параўнанні з любой іншай краінай, дзе старое абсталяванне вісіць на нагах у вытворчасці і тармозіць справу ўнядрэння новай тэхнікі.

У галіне грамадска-палітычнага развіцця краіны найбольш важным заваяваннем за справаздачны перыяд трэба прызнаць канчатковую ліквідацыю астаткаў эксплуататарскіх класаў, згуртаванне рабочых, сялян і інтэлігенцыі ў адзін агульны працоўны фронт, умацаванне маральна-палітычнага адзінства совецкага грамадства, умацаванне дружбы народаў нашай краіны і, як рэзультат усяго гэтага,—поўную дэмакратызацыю палітычнага жыцця краіны, стварэнне новай Канстытуцыі. Ніхто не смее аспрэчваць, што наша Канстытуцыя з'яўляецца найбольш дэмакратычнай у свеце, а рэзультаты выбараў у Вярхоўны Совет СССР, таксама як і ў Вярхоўныя Советы саюзных рэспублік—найбольш паказальнымі.

У выніку ўсяго гэтага мы маем поўную ўстойлівасць унутранага становішча і такую моцнасць улады ў краіне, якой мог-бы пазайздросціць любы ўрад у свеце.

Разгледзім канкрэтныя даныя аб эканамічным і палітычным становішчы нашай краіны.

1. Далейшы ўздым прамысловасці і сельскай гаспадаркі

а) **Прамысловасць.** Рух нашай прамысловасці за справаздачны перыяд прадстаўляе карціну няўхільнага ўздыму. Уздым гэты адлюстроўвае не толькі рост прадукцыі наогул, але, перш за ўсё, — працвітанне соцыялістычнай прамысловасці, з аднаго боку, гібель прыватнай прамысловасці, з другога боку.

Вось адпаведная табліца:

РОСТ ПРАМЫСЛОВАСЦІ СССР ЗА 1934—1938 г.г.

	1933 г.	1934 г.	1935 г.	1936 г.	1937 г.	1938 г.	У %% да папярэдняга года: 1934 г.	1935 г.	1936 г.	1937 г.	1938 г.	1938 г. у %% да 1933 г.
	У млн. руб. у цэнах 1926/27 г.											
Уся прадукцыя	42030	50477	62137	80929	90166	100375	120,1	123,1	130,2	111,4	111,3	238,8
У тым ліку:												
1. Соцыялістычная прамысловасць	42002	50443	62114	80898	90138	100349	120,1	123,1	130,2	111,4	111,3	238,9
2. Прыватная прамысловасць	28	34	23	31	28	26	121,4	67,6	134,8	90,3	92,9	92,9
	у процантах											
Уся прадукцыя	100	100	100	100	100	100						
У тым ліку:												
1. Соцыялістычная прамысловасць	99,93	99,93	99,96	99,96	99,97	99,97						
2. Прыватная прамысловасць	0,07	0,07	0,04	0,04	0,03	0,03						

З гэтай табліцы відаць, што наша прамысловасць вырасла за справаздачны перыяд больш, чым у два разы, прычым увесь рост прадукцыі ішоў за кошт соцыялістычнай прадукцыі.

З гэтай табліцы відаць, далей, што соцыялістычная сістэма з'яўляецца адзінай сістэмай прамысловасці СССР.

З гэтай табліцы відаць, нарэшце, што канчатковая гібель прыватнай прамысловасці з'яўляецца фактам, якога не могуць адмаўляць цяпер нават сляпыя.

Гібель прыватнай прамысловасці нельга лічыць выпадковасцю. Яна загінула, перш за ўсё, таму, што соцыялістычная сістэма гаспадаркі з'яўляецца вышэйшай сістэмай у параўнанні з сістэмай капіталістычнай. Яна загінула, па-другое, таму, што соцыялістычная сістэма гаспадаркі дала нам магчымасць у некалькі год пераабсталяваць усю нашу соцыялістычную прамысловасць на новай, сучаснай тэхнічнай базе. Такой магчымасці не дае і не можа даць капіталістычная сістэма гаспадаркі. Гэта факт, што з пункту гледжання тэхнікі вытворчасці, з пункту гледжання аб'ёму насычанасці прамысловай вытворчасці новай тэхнікай, наша прамысловасць стаіць на першым месцы ў свеце.

Калі ўзяць тэмпы росту нашай прамысловасці ў процантах к даваеннаму ўзроўню і параўнаць іх з тэмпамі росту прамысловасці галоўных капіталістычных краін, то атрымаецца наступная карціна:

РОСТ ПРАМЫСЛОВАСЦІ СССР І ГАЛОЎНЫХ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІН ЗА 1913—1938 г.г.

	1913 г.	1933 г.	1934 г.	1935 г.	1936 г.	1937 г.	1938 г.
СССР	100,0	380,5	457,0	562,6	732,7	816,4	908,8
ЗША	100,0	108,7	112,9	128,6	149,8	156,9	120,0
АНГЛІЯ	100,0	87,0	97,1	104,0	114,2	121,9	113,3
ГЕРМАНІЯ	100,0	75,4	90,4	105,9	118,1	129,3	131,6
ФРАНЦЫЯ	100,0	107,0	99,0	94,0	98,0	101,0	93,2

З гэтай табліцы відаць, што наша прамысловасць вырасла ў параўнанні з даваенным узроўнем больш, чым у дзевяць разоў, тады як прамысловасць галоўных капіталістычных краін прадаўжае таптацца вакол даваеннага ўзроўню, перавышаючы яго ўсяго толькі на 20—30 процантаў.

Гэта значыць, што па тэмпах росту наша соцыялістычная прамысловасць стаіць на першым месцы ў свеце.

Выходзіць, такім чынам, што па тэхніцы вытворчасці і тэмпах росту нашай прамысловасці мы ўжо дагналі і перагналі галоўныя капіталістычныя краіны.

У чым-жа мы адстаем? Мы ўсё яшчэ адстаем у эканамічных адносінах, г. зн. у адносінах размераў нашай прамысловай вытворчасці на душу насельніцтва. Мы вытварылі ў 1938 г. каля 15 мільёнаў тон чыгуну, а Англія — 7 мільёнаў тон. Здавалася-б, справа абстаіць у нас лепш, чым у Англіі. Але калі раскласці гэтыя тоны чыгуну на колькасць насельніцтва, то атрымліваецца, што ў Англіі на кожную душу насельніцтва ў 1938 годзе прыходзілася 145 кілаграмаў чыгуну, а ў СССР — усяго 87 кілаграмаў. Або яшчэ: Англія вытварыла ў 1938 г. 10 мільёнаў і 800 тысяч тон сталі і каля 29 мільярдаў кіловат-гадзін (вытворчасць электраэнергіі), а СССР вытварыў 18 мільёнаў тон сталі і больш 39 мільярдаў кіловат-гадзін. Здавалася-б, справа ў нас абстаіць лепш, чым у Англіі. Але калі раскласці ўсе гэтыя тоны і кіловат-гадзіны на колькасць насельніцтва, то атрымліваецца, што ў Англіі прыходзілася на кожную душу насельніцтва ў 1938 годзе 226 кілаграмаў сталі і 620 кіловат-гадзін, тады як у СССР прыходзілася ўсяго 107 кілаграмаў сталі і 233 кіловат-гадзіны на душу насельніцтва.

У чым-жа справа? А ў тым, што насельніцтва ў нас у некалькі разоў больш, чым у Англіі, стала быць і патрэбнасцей больш, чым у Англіі: у Совецкім Саюзе 170 мільёнаў на-

(Працяг даклада на 3-й стар.).

Працяг справаздачнага даклада таварыша СТАЛІНА

сельніцтва, а ў Англіі не больш 46 мільёнаў. Эканамічная магутнасць прамысловасці выражаецца не ў аб'ёме прамысловай прадукцыі наогул, безадносна да насельніцтва краіны, а ў аб'ёме прамысловай прадукцыі, узятым у яго прамой сувязі з размерамі спажывання гэтай прадукцыі на душу насельніцтва. Чым больш прыходзіцца прамысловай прадукцыі на душу насельніцтва, тым вышэй эканамічная магутнасць краіны, і наадварот, чым менш прыходзіцца прадукцыі на душу насельніцтва, тым ніжэй эканамічная магутнасць краіны і яе прамысловасці. Значыцца, чым больш насельніцтва ў краіне, тым больш у краіне патрэбнасцей у прадметах спажывання, стала быць, тым больш павінен быць аб'ём прамысловай вытворчасці такой краіны.

Узяць, напрыклад, вытворчасць чыгуну. Каб перагнаць Англію эканамічна ў галіне вытворчасці чыгуну, вытворчасць якога складала там у 1938 годзе 7 млн. тон, нам трэба давесці штогоднюю выплаўку чыгуну да 25 мільёнаў тон. Каб перагнаць эканамічна Германію, якая вытварыла ў 1938 годзе ўсяго 18 мільёнаў тон чыгуну, нам трэба давесці штогоднюю выплаўку чыгуну да 40—45 мільёнаў тон. А каб перагнаць ЗША эканамічна, маючы на ўвазе не ўзровень 1938 крызіснага года, калі ЗША вытварылі ўсяго 18,8 мільёна тон чыгуну, а ўзровень 1929 года, калі ў ЗША быў уздым прамысловасці і калі там вытваралася каля 43 мільёнаў тон чыгуну, мы павінны давесці штогоднюю выплаўку чыгуну да 50—60 мільёнаў тон.

Тое-ж самае трэба сказаць аб вытворчасці сталі, пракату, аб машынабудаўніцтве і т. д., бо ўсе гэтыя галіны прамысловасці, як і астатнія галіны, залежаць у канчатковым выніку ад вытворчасці чыгуну.

Мы перагналі галоўныя капіталістычныя краіны ў сэнсе тэхнікі вытворчасці і тэмпаў развіцця прамысловасці. Гэта вельмі добра. Але гэтага мала. Трэба перагнаць іх таксама ў эканамічных адносінах. Мы гэта можам зрабіць, і мы гэта павінны зрабіць. Толькі ў тым выпадку, калі перагонім эканамічна галоўныя капіталістычныя краіны, мы можам разлічваць, што наша краіна будзе поўнасцю насычана прадметамі спажывання, у нас будзе багацце прадуктаў, і мы атрымаем магчымасць зрабіць пераход ад першай фазы комунізма да другой яго фазы.

Што патрабуецца для таго, каб перагнаць эканамічна галоўныя капіталістычныя краіны? Для гэтага патрабуецца, перш за ўсё, сур'ёзнае і нястрымнае жаданне ісці ўперад і гатоўнасць пайсці на афяры, пайсці на сур'ёзныя капітальныя ўкладанні для ўсямернага расшырэння нашай соцыялістычнай прамысловасці. Ці ёсць у нас гэтыя даныя? Безумоўна ёсць! Для гэтага патрабуецца, далей, наяўнасць высокай тэхнікі вытворчасці і высокіх тэмпаў развіцця прамысловасці. Ці ёсць у нас гэтыя даныя? Безумоўна ёсць! Для гэтага патрабуецца, нарэшце, час. Так, таварышы, час. Трэба будаваць новыя заводы. Трэба каваць новыя кадры для прамысловасці. Але для гэтага неабходзен час, і не малы. Немагчыма ў 2—3 гады перагнаць эканамічна галоўныя капіталістычныя краіны. Для гэтага патрабуецца некалькі больш часу. Узяць, напрыклад, той-жа чыгун і яго вытворчасць. На працягу якога перыяду часу можна перагнаць эканамічна галоўныя капіталістычныя краіны ў галіне вытворчасці чыгуну? Некаторыя работнікі Дзяржплана старога састава прапанавалі пры складанні другога пяцігадовага плана запланіраваць вытворчасць чыгуну к канцу другой пяцігодкі ў размеры 60 мільёнаў тон. Гэта значыць, што яны выходзілі з магчымасці сярэднегадовага прыросту выплаўкі чыгуну ў размеры 10 мільёнаў тон. Гэта была, вядома, фантастыка, калі не горш. Між іншым, гэтыя таварышы ўдараліся ў фантастыку не толькі ў галіне вытворчасці чыгуну. Яны лічылі, напрыклад, што на працягу другой пяцігодкі штогодні прырост насельніцтва ў СССР павінен скласці тры—чатыры мільёны чалавек, або нават больш гэтага. Гэта таксама была фантастыка, калі не горш. Але калі адкінуць прэч фантазёраў і стаць на рэальную глебу, то можна прыняць, як зусім магчымы, сярэднегадовы прырост выплаўкі чыгуну ў размеры двух—двух з палавінай мільёнаў тон, маючы на ўвазе сучасны стан тэхнікі выплаўкі чыгуну. Гісторыя прамысловасці галоўных капіталістычных краін, таксама як і нашай краіны, паказвае, што гэтая норма штогодняга прыросту з'яўляецца напружанай, але зусім дасягальнай.

Стала быць, патрабуецца час, і не малы, для таго, каб перагнаць эканамічна галоўныя капіталістычныя краіны. І чым вышэй будзе ў нас прадукцыйнасць працы, чым больш удасканальвацца будзе ў нас тэхніка вытворчасці, тым хутчэй можна будзе выканаць гэтую важнейшую эканамічную задачу, тым больш можна будзе скараціць тэрміны выканання гэтай задачы.

б). **Сельская гаспадарка.** Развіццё сельскай гаспадаркі ішло за справаздачны перыяд, таксама як і развіццё прамысловасці, па лініі ўздыму. Уздым гэты выражаецца не толькі ў росце сельскагаспадарчай прадукцыі, але, перш за ўсё, у росце і ўмацаванні соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, з аднаго боку, гібелі аднаасобнай гаспадаркі, з другога боку. У той час як пасеўная плошча зернавых у калгасаў вырасла з 75 мільёнаў у 1933 г. да 92 мільёнаў гектараў у 1938 г., пасеўная плошча зернавых у аднаасобнікаў скарацілася за гэты перыяд з 15,7 мільёна гектараў да 600 тысяч гектараў, г. зн. да 0,6 процанта ўсёй пасеўнай плошчы зернавых. Я ўжо не гавару аб пасеўных плошчах па тэхнічных культурах, дзе роля аднаасобнай гаспадаркі зведзена да нуля. Вядома, апрача таго, што ў калгасах аб'яднана цяпер 18 млн. 800 тысяч сялянскіх двароў, г. зн. 93,5 процанта ўсіх сялянскіх двароў, не лічачы рыбалавецкіх і прамысловых калгасаў.

Гэта значыць, што калгасы канчаткова замацаваны і ўпрочаны, а соцыялістычная сістэма гаспадаркі з'яўляецца цяпер адзінай формай нашага земляробства.

Калі параўнаць рух пасеўных плошчаў па ўсіх культурах за справаздачны перыяд з размерамі пасеўных плошчаў дарэвалюцыйнага перыяду, то атрымаецца наступная карціна:

ПАСЕЎНЫЯ ПЛОШЧЫ УСІХ КУЛЬТУР ПА СССР

	У мільёнах гектараў						
	1913 г.	1934 г.	1935 г.	1936 г.	1937 г.	1938 г.	1938 г. у %% да 1913 г.
Уся пасеўная плошча	105,0	131,5	132,8	133,8	135,3	136,9	130,4
У тым ліку:							
а) зернавыя	94,4	104,7	103,4	102,4	104,4	102,4	108,5
б) тэхнічныя	4,5	10,7	10,6	10,8	11,2	11,0	244,4
в) гароднe-бахчавыя	3,8	8,8	9,9	9,8	9,0	9,4	247,4
г) кармавыя	2,1	7,1	8,6	10,6	10,6	14,1	671,4

З гэтай табліцы відаць, што пасеўныя плошчы выраслі ў нас па ўсіх культурах і перш за ўсё — па лініі кармавых, тэхнічных і гародне-бахчавых культур.

Гэта значыць, што наша земляробства становіцца больш кваліфікаваным і прадукцыйным, а ўнядрэнне правільнага севаабароту атрымлівае пад сабою рэальную глебу.

Як расла ўзброенасць нашых калгасаў і соўгасаў трактарамі, камбайнамі і іншымі машынамі за справаздачны перыяд, — адказ на гэта даюць наступныя табліцы:

1) ТРАКТАРНЫ ПАРК У СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ СССР

	1933 г.	1934 г.	1935 г.	1936 г.	1937 г.	1938 г.	1938 г. у %% да 1933 г.
А) Колькасць трактараў (у тыс. шт.)							
Усяго трактараў	210,9	276,4	360,3	422,7	454,5	483,5	229,3
У тым ліку:							
а) трактараў у МТС	123,2	177,3	254,7	328,5	365,8	394,0	319,8
б) трактараў у соўгасах і падсобных с.-г. прадпрыемствах	83,2	95,5	102,1	88,5	84,5	85,0	102,2
Б) Магутнасць у тыс. конскіх сіл							
Усіх трактараў	3209,2	4462,8	6184,0	7672,4	8385,0	9256,2	288,4
У тым ліку:							
а) трактараў у МТС	1758,1	2753,9	4281,6	5856,0	6679,2	7437,0	423,0
б) трактараў у соўгасах і падсобных с.-г. прадпрыемствах	1401,7	1669,5	1861,4	1730,7	1647,5	1751,8	125,0

2) ПАРК КАМБАЙНАЎ І ІНШЫХ МАШЫН У СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ СССР

	1933 г.	1934 г.	1935 г.	1936 г.	1937 г.	1938 г.	1938 г. у %% да 1933 г.
Камбайны	25,4	32,3	50,3	87,8	128,8	153,5	604,3
Рухавікі ўнутранага згарання і лакамабілі	48,0	60,9	69,1	72,4	77,9	83,8	174,6
Складаныя і поўскладаныя зернавыя малатарні	120.3	121,9	120,1	123,7	126,1	130,8	108,7
Грузавыя аўтамабілі	26,6	40,3	63,7	96,2	144,5	195,8	736,1
Легкавыя аўтамабілі (у шт.)	3991	5533	7555	7630	8156	9594	240,4

Калі да гэтых цыфр дадаць той факт, што колькасць машынна-трактарных станцый за справаздачны перыяд вырасла ў нас з 2900 адзінак у 1934 г. да 6350 адзінак у 1938 г., то можна на падставе ўсіх гэтых даных з упэўненасцю сказаць, што рэканструкцыя нашага земляробства на аснове новай, сучаснай тэхнікі — ужо завершана ў асноўным.

Наша земляробства з'яўляецца, значыцца, не толькі найбольш буйным і механізаваным, а значыць і найбольш таварным земляробствам, але і найбольш аснашчоным сучаснай тэхнікай, чым земляробства любой іншай краіны.

Калі ўзяць рух росту прадукцыі зернавых і тэхнічных культур за справаздачны перыяд у параўнанні з дарэвалюцыйным перыядам, то даныя даюць наступную карціну:

ВАЛАВАЯ ПРАДУКЦЫЯ ЗЕРНАВЫХ І ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР ПА СССР

	У мільёнах цэнтнераў						
	1913 г.	1934 г.	1935 г.	1936 г.	1937 г.	1938 г.	1938 г. у %% да 1913 г.
Зернавыя	801,0	894,0	901,0	827,3	1202,9	949,9	118,6
Бавоўна (сырэц)	7,4	11,8	17,2	23,9	25,8	26,9	363,5
Лён (валакно)	3,3	5,3	5,5	5,8	5,7	5,46	165,5
Цукровыя буракі	109,0	113,6	162,1	168,3	218,6	166,8	153,0
Маслічныя	21,5	36,9	42,7	42,3	51,1	46,6	216,7

З гэтай табліцы відаць, што, не гледзячы на засуху ва ўсходніх і паўднёва-ўсходніх раёнах у 1936 г. і ў 1938 г. і не гледзячы на небывала высокі ўраджай у 1913 годзе, рост валавой прадукцыі зярна і тэхнічных культур ішоў у нас за справаздачны перыяд няўхільна ўверх у параўнанні з узроўнем 1913 года.

Асабліва цікава пытанне аб таварнасці калгасна-соўгаснай зернавой вытворчасці. Вядомы статыстык т. Немчынаў вылічыў, што з пяці мільярдаў пудоў валавой прадукцыі зярна ў даваенны час на рынак адпускалася таварнага зярна ўсяго каля 1 мільярда 300 мільёнаў пудоў, што складае 26 процантаў таварнасці тагачаснай зернавой вытворчасці. Тав. Немчынаў лічыць, што таварнасць калгаснай і соўгаснай вытворчасці, як вытворчасці буйной, напрыклад, у 1926—1927 гадах складала каля 47 процантаў валавой прадукцыі, а таварнасці аднаасобнай сялянскай гаспадаркі — каля 12 процантаў. Калі падыйсці да справы больш асцярожна і прыняць таварнасць калгасна-соўгаснай вытворчасці ў 1938 годзе ў 40 процантаў валавой вытворчасці, то атрымаецца, што наша соцыялістычная зернавая гаспадарка магла адпусціць і сапраўды адпусціла ў гэтым годзе на старану каля двух мільярдаў і трохсот мільёнаў пудоў таварнага зярна, г. зн. на 1 мільярд пудоў больш таварнага зярна, чым даваенная зернавая вытворчасць.

Значыцца, высокая таварнасць соўгасна-калгаснай вытворчасці з'яўляецца яе важнейшай асаблівасцю, якая мае сур'ёзнейшае значэнне для снабжэння краіны.

У гэтай іменна асаблівасці калгасаў і соўгасаў заключаецца сакрэт таго, што нашай краіне ўдалося так лёгка і быстра вырашыць зернавую праблему, праблему дастатковага снабжэння велізарнай краіны таварным зярном.

Трэба адзначыць, што за апошнія тры годы штогоднія загатоўкі зярна не спускаліся ў нас ніжэй мільярда шасцісот мільёнаў пудоў зярна, падымаючыся часам, напрыклад, у 1937 годзе да мільярда 800 мільёнаў пудоў. Калі дадаць да гэтага каля 200 мільёнаў штогодняй закупкі зярна ды некалькі сот мільёнаў па лініі калгаснага гандлю зярном, то мы атрымаем у агульным тую суму водпуску на старану таварнага хлеба калгасамі і соўгасамі, аб якой упаміналася вышэй.

Цікава, далей, адзначыць, што за апошнія тры годы база таварнага зярна перамясцілася з Украіны, якая лічылася раней жытніцай нашай краіны, на поўнач і ўсход, г. зн. у РСФСР. Вядома, што за апошнія два—тры годы Украіна загатаўляе зярна ўсяго каля 400 мільёнаў пудоў штогодна, тады як РСФСР загатаўляе за гэтыя годы штогодна мільярд сто—мільярд дзвесце мільёнаў пудоў таварнага зярна.

Так абстаіць справа з зернавой вытворчасцю.

Што датычыць жывёлагадоўлі, то і ў гэтай, найбольш адсталай, галіне сельскай гаспадаркі намеціліся за апошнія годы сур'ёзныя зрухі. Праўда, па конскаму пагалоўю і аўцагадоўлі мы яшчэ адстаем ад дарэвалюцыйнага ўзроўню, але па буйной рагатай жывёле і свінагадоўлі мы пераваліл ўжо дарэвалюцыйны ўзровень.

Вось даныя наконт гэтага:

ПАГАЛОЎЕ ЖЫВЁЛЫ ПА СССР (у млн. галоў)

	На ліпень месяц							1938 г. у %%	
	1916 г. па даных перапісу	1933 г.	1934 г.	1935 г.	1936 г.	1937 г.	1938 г.	Да 1916 г. па перапісу	Да 1933 г.
Коні	35,8	16,6	15,7	15,9	16,6	16,7	17,5	48,9	105,4
Буйная рагатая жывёла	60,6	38,4	42,4	49,2	56,7	57,0	63,2	104,3	164,6
Авечкі і козы	121,2	50,2	51,9	61,1	73,7	81,3	102,5	84,6	204,2
Свінні	20,9	12,1	17,4	22,5	30,5	22,8	30,6	146,4	252,9

Не можа быць сумнення, што адсталасць у галіне конегадоўлі і аўцагадоўлі будзе ліквідавана ў найкарацейшы тэрмін.

в) **Тавараабарот, транспарт.** Разам з уздымам прамысловасці і сельскай гаспадаркі рос і тавараабарот у краіне. Рознічная сетка дзяржаўнага і кааперацыйнага гандлю вырасла за справаздачны перыяд на 25 процантаў. Рознічны абарот дзяржаўнага і кааперацыйнага гандлю вырас на 178 процантаў. Абарот калгасна-базарнага гандлю вырас на 112 процантаў.

Вось адпаведная табліца:

ТАВАРААБАРОТ

	1933 г.	1934 г.	1935 г.	1936 г.	1937 г.	1938 г.	1938 г. у %% да 1933 г.
1. Рознічная сетка дзяржаўнага і кааперацыйнага гандлю (магазіны і палаткі) на канец года	285355	286236	268713	289473	327361	356930	125,1
2. Рознічны абарот дзяржаўнага і кааперацыйнага гандлю (уключаючы грамадскае харчаванне)—у млн. руб.	49789,2	61814,7	81712,1	106760,9	125943,2	138574,3	278,3
3. Абарот калгаснага базарнага гандлю ў млн. руб.	11500,0	14000,0	14500,0	15607,2	17799,7	24399,2	212,2
4. Абласныя гандлёвыя базы збытаў Наркамхарчпрома, НКЛегпрома, НКЦяжпрома, НКЛеса, НК мяспромаў саюзных рэспублік—на канец года	718	836	1141	1798	1912	1994	277,7

Зразумела, што тавараабарот у краіне не мог-бы так разгарнуцца без пэўнага росту транспартных перавозак. І сапраўды, перавозкі выраслі за справаздачны перыяд па ўсіх відах транспарта, асабліва па чыгуначнаму і паветранаму транспарту. Перавозкі выраслі таксама па воднаму транспарту, але з вялікімі ваганнямі, а ў 1938 годзе перавозкі па воднаму транспарту далі, на жаль, некаторае зніжэнне ў параўнанні з папярэднім годам.

Вось адпаведная табліца:

ГРУЗААБАРОТ

	1933 г.	1934 г.	1935 г.	1936 г.	1937 г.	1938 г.	1938 г. у %% да 1933 г.
Чыгункі (у мільярдах тона-кілометраў)	169,5	205,7	258,1	323,4	354,8	369,1	217,7
Рачны і марскі транспарт (у мільярдах тона-кілометраў)	50,2	56,5	68,3	72,3	70,1	66,0	131,5
Грамадзянскі паветраны флот (у мільёнах тона-кілометраў)	3,1	6,4	9,8	21,9	24,9	31,7	1022,6

Не можа быць сумнення, што некаторая адсталасць воднага транспарта ў 1938 годзе будзе ліквідавана ў 1939 годзе.

2. Далейшы ўздым матэрыяльнага і культурнага становішча народа

Прадаўжаючыйся ўздым прамысловасці і сельскай гаспадаркі не мог не прывесці і сапраўды прывёў да новага росту матэрыяльнага і культурнага становішча народа.

Знішчэнне эксплуатацыі і ўмацаванне соцыялістычнай сістэмы ў народнай гаспадарцы, адсутнасць беспрацоўя і звязанай з ім нішчаты ў горадзе і вёсцы, велізарнае расшырэнне прамысловасці і няспынны рост колькасці рабочых, рост прадукцыйнасці працы рабочых і калгаснікаў, замацаванне зямлі навечна за калгасамі і снабжэнне калгасаў велізарнай колькасцю першакласных трактараў і сельскагаспадарчых машын, — усё гэта стварыла рэальныя ўмовы для далейшага росту матэрыяльнага становішча рабочых і сялян. Палепшанне-ж матэрыяльнага становішча рабочых і сялян натуральна прывяло да палепшання матэрыяльнага становішча інтэлігенцыі, якая прадстаўляе значную сілу нашай краіны і абслугоўвае інтарэсы рабочых і сялян.

Цяпер ужо гутарка ідзе не аб тым, каб прыстроіць як-небудзь у прамысловасці і ўзяць з міласці на работу беспрацоўных і бяздомных сялян, якія адбіліся ад вёскі і жывуць пад страхам голаду. Такіх сялян даўно ўжо няма ў нашай краіне. І гэта, вядома, добра, бо яно сведчыць аб заможнасці нашай вёскі. Цяпер гутарка можа ісці толькі аб тым, каб прапанаваць калгасам уважыць нашу просьбу і адпускаць нам для растучай прамысловасці штогодна хоць-бы каля паўтара мільёна маладых калгаснікаў. Калгасы, стаўшыя ўжо заможнымі, павінны мець на ўвазе, што без такой дапамогі з іх боку вельмі трудна будзе расшыраць далей нашу прамысловасць, а без расшырэння прамысловасці — не зможам задавальняць растучы попыт сялян на тавары масавага спажывання. Калгасы маюць поўную магчымасць задаволіць гэтую нашу просьбу, бо багацце тэхнікі ў калгасах аслабаняе частку работнікаў у вёсцы, а гэтыя работнікі, пераведзеныя ў прамысловасць, маглі-б прынесці велізарную карысць усёй нашай народнай гаспадарцы.

У выніку мы маем наступныя паказальнікі палепшання матэрыяльнага становішча рабочых і сялян за справаздачны перыяд:

1. Народны даход узрос з 48,5 мільярда рублёў у 1933 г. да 105,0 мільярдаў рублёў у 1938 г.;

2. Колькасць рабочых і служачых паднялася з 22 мільёнаў з лішнім чалавек у 1933 г. да 28 мільёнаў чалавек у 1938 г.;

3. Гадовы фонд заработнай платы рабочых і служачых вырас з 34.953 мільёнаў рублёў да 96.425 мільёнаў рублёў;

4. Сярэднегадовая заработная плата рабочых прамысловасці, складаўшая ў 1933 г. 1.513 рублёў, паднялася да 3.447 рублёў у 1938 г.;

5. Грашовыя даходы калгасаў падняліся з 5.661,9 мільёна рублёў у 1933 г. да 14.180,1 мільёна рублёў у 1937 г.;

6. Сярэдняя выдача зярна ў зернавых раёнах на адзін калгасны двор паднялася з 61 пуда ў 1933 годзе да 144 пудоў у 1937 годзе, не лічачы насення, насенных страхавых фондаў, кармовага фонда для грамадскай жывёлы, зернапаставак, натураплаты работ МТС;

7. Дзяржаўныя асігнаванні па бюджэту на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы ўзраслі з 5.839,9 мільёна рублёў у 1933 г. да 35.202,5 мільёна рублёў у 1938 годзе.

Што датычыць культурнага становішча народа, то яго ўздым ішоў услед за ўздымам матэрыяльнага становішча народа.

З пункту гледжання культурнага развіцця народа справаздачны перыяд быў сапраўды перыядам культурнай рэволюцыі. Унядрэнне ў жыццё ўсеагульна-абавязковай першапачатковай асветы на мовах нацыянальнасцей СССР, рост ліку школ і навучаючыхся ўсіх ступеней, рост ліку выпускаемых вышэйшымі школамі спецыялістаў, стварэнне і ўмацаванне новай, савецкай інтэлігенцыі, — такая агульная карціна культурнага ўздыму народа.

Вось даныя наконт гэтага:

І. ПАВЫШЭННЕ КУЛЬТУРНАГА УЗРОЎНЮ НАРОДА

Паказальнікі	Адзінкі вымярэння	1933/34 г.	1938/39 г.	1938/39 г. у %% да 1933/34 г.
Лік навучаючыхся ў школах усіх ступеней	тыс. чал.	23814	33965,4	142,6
На пачатковай асвеце	тыс. чал.	17873,5	21288,4	119,1
На сярэдняй асвеце (агульнай і спецыяльнай)	тыс. чал.	5482,2	12076,0	220,3
На вышэйшай асвеце	тыс. чал.	458,3	601,0	131,1
Лік навучаючыхся ў СССР, (уключаючы усе віды навучання)	тыс. чал.	—	47442,1	—
Лік масавых бібліятэк	тысяч	40,3	70,0	173,7
Лік кніг у іх	млн.	86,0	126,6	147,2
Лік клубных устаноў	тысяч	61,1	95,6	156,5
Лік тэатраў	адзінак	587	790	134,6
Лік кінаўстановак (без вузкаплёначных)	адзінак	27467	30461	110,9
У тым ліку гукавых	адзінак	498	15202	у 31 раз
Лік кінаўстановак (без вузкаплёначных) на сяле	адзінак	17470	18991	108,7
У тым ліку гукавых	адзінак	24	6670	у 278 раз
Гадавы тыраж газет	млн.	4984,6	7092,4	142,3

2. ПАБУДАВАНА ШКОЛ ЗА 1933—1938 гг. па СССР

Годы	Колькасць школ		Усяго
	У гарадах і паселішчах гарадскога тыпу	У сельскіх мясцовасцях	
1933	326	3261	3587
1934	577	3488	4065
1935	533	2829	3362
1936	1505	4206	5711
1937	730	1323	2053
1938	583	1246	1829
Усяго за 1933—38 гг.	4254	16353	20607

(Працяг даклада на 4-й стар.).

Працяг справаздачнага даклада таварыша СТАЛІНА

3. ВЫПУШЧАНА МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ З ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ ЗА 1933—1938 гг. (у тыс.)

	1933 г.	1934 г.	1935 г.	1936 г.	1937 г.	1938 г.
Усяго па СССР (не лічачы ваенных спецыялістаў)	34,6	49,2	83,7	97,6	104,8	106,7
1. Інжынеры прамысловасці і будаўніцтва	6,1	14,1	29,6	29,2	27,6	25,2
2. Інжынеры транспарта і сувязі	1,8	4,0	7,6	6,6	7,0	6,1
3. Інжынеры па механізацыі сельскай гаспадаркі, аграномы, ветэрынарныя ўрачы і заатэхнікі	4,8	6,3	8,8	10,4	11,3	10,6
4. Эканамісты і юрысты	2,5	2,5	5,0	6,4	5,0	5,7
5. Выкладчыкі сярэдняй школы, рабфакаў, тэхнікумаў і іншыя работнікі асветы, у тым ліку работнікі мастацтва	10,5	7,9	12,5	21,6	31,7	35,7
6. Урачы, правізары і работнікі фізічнай культуры	4,6	2,5	7,5	9,2	12,3	13,6
7. Іншыя спецыяльнасці	4,3	11,1	12,7	14,2	9,9	9,8

У рэзультаце ўсёй гэтай велізарнай культурнай работы нарадзілася і склалася ў нас шматлікая новая, савецкая інтэлігенцыя, якая выйшла з радоў рабочага класа, сялянства, савецкіх служачых, плоць ад плоці і кроў ад крыві нашага народа, — інтэлігенцыя, якая не ведае ярма эксплуатацыі, ненавідзіць эксплуататараў і гатова служыць народам СССР верай і праўдай.

Я думаю, што нараджэнне гэтай новай, народнай, сацыялістычнай інтэлігенцыі з'яўляецца адным з самых важных рэзультатаў культурнай рэвалюцыі ў нашай краіне.

3. Далейшае ўмацаванне савецкага ладу

Адзін з важнейшых рэзультатаў справаздачнага перыяду заключаецца ў тым, што ён прывёў да далейшага ўмацавання ўнутранага становішча краіны, да далейшага ўмацавання савецкага ладу.

Інакш і не магло быць. Упвярджэнне сацыялістычнай сістэмы ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, уздым прамысловасці і сельскай гаспадаркі, уздым матэрыяльнага становішча працоўных, павышэнне культурнасці народных мас, павышэнне іх палітычнай актыўнасці, — усё гэта, ажыццёўленае пад кіраўніцтвам савецкай улады, не магло не прывесці да далейшага ўмацавання савецкага ладу.

Асаблівасць савецкага грамадства цяперашняга часу, у адрозненне ад любога капіталістычнага грамадства, заключаецца ў тым, што ў ім няма больш антаганістычных, варожых класаў, эксплуататарскія класы ліквідаваны, а рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя, складаючыя савецкае грамадства, жывуць і працуюць на пачатках дружаственага супрацоўніцтва. У той час як капіталістычнае грамадства раздзіраецца непрымірымымі супярэчнасцямі паміж рабочымі і капіталістамі, паміж сялянамі і памешчыкамі, што вядзе да няўстойлівасці яго ўнутранага становішча, савецкае грамадства, вызваленае ад іга эксплуатацыі, не ведае такіх супярэчнасцей, свабодна ад класавых сутычак і прадстаўляе карціну дружаственага супрацоўніцтва рабочых, сялян, інтэлігенцыі. На аснове гэтай агульнасці і разгарнуліся такія рухаючыя сілы, як маральна-палітычнае адзінства савецкага грамадства, дружба народаў СССР, савецкі патрыятызм. На гэтай-жа аснове ўзніклі Канстытуцыя СССР, прынятая ў лістападзе 1936 г., і поўная дэмакратызацыя выбараў у вярхоўныя органы краіны.

Што датычыць саміх выбараў у вярхоўныя органы краіны, то яны паслужылі бліскучай дэманстрацыяй таго самага адзінства савецкага грамадства і той самай дружбы народаў СССР, якія складаюць характэрную асаблівасць унутранага становішча нашай краіны. Як вядома, на выбарах у Вярхоўны Совет СССР у снежні 1937 г. за блок комуністаў і беспартыйных галасавала амаль 90 мільёнаў выбаршчыкаў, г. зн. 98,6 процанта ўсіх прымаўшых удзел у галасаванні, а на выбарах у Вярхоўныя Советы саюзных рэспублік у чэрвені 1938 г. за блок комуністаў і беспартыйных галасавала 92 мільёны выбаршчыкаў, г. зн. 99,4 процанта ўсіх прымаўшых удзел у галасаванні.

Вось дзе аснова моцнасці савецкага ладу і крыніца невычарпальнай сілы савецкай улады.

Гэта значыць, між іншым, што ў выпадку вайны тыл і фронт нашай арміі з прычыны іх аднароднасці і ўнутранага адзінства — будуць мацнейшымі, чым у любой іншай краіне, аб чым трэба было-б памятаць зарубежным любіцелям ваенных сутычак.

Некаторыя дзеячы зарубежнай прэсы балбочуць, што ачышчэнне савецкіх арганізацый ад шпіёнаў, забойцаў і шкоднікаў накшталт Троцкага, Зіноўева, Каменева, Якіра, Тухачэўскага, Розенгольца, Бухарына і іншых ізвергаў «пахіснула» быццам-бы савецкі лад, унесла «разлажэнне». Гэта пошлая балбатня варта таго, каб паздзеквацца над ёю. Як можа пахіснуць і разлажыць савецкі лад ачышчэнне савецкіх арганізацый ад шкодных і варожых элементаў? Трацкісцка-бухарынская кучка шпіёнаў, забойц і шкоднікаў, прасмыкаўшаяся перад заграніцай, пранікнутая раб'ім пачуццём нізкапаклонства перад кожным іншакраінным чынушай і гатовая пайсці да яго ў шпіёнскае ўслужэнне, — кучка людзей, не зразумеўшая таго, што апошні савецкі грамадзянін, свабодны ад ланцугоў капітала, стаіць галавой вышэй любога зарубежнага высокапастаўленага чынушы, цягнучага на плячах ярмо капіталістычнага рабства, — каму патрэбна гэта жалкая банда прадажных рабоў, якую каштоўнасць яна можа прадстаўляць для народа і каго яна можа «разлажыць»? У 1937 годзе былі прыгавораны да расстрэлу Тухачэўскі, Якір, Убарэвіч і іншыя ізвергі. Пасля гэтага адбыліся выбары ў Вярхоўны Совет СССР. Выбары далі савецкай уладзе 98.6 процанта ўсіх удзельнікаў галасавання. У пачатку 1938 г. былі прыгавораны да расстрэлу Розенгольц, Рыкаў, Бухарын і іншыя ізвергі. Пасля гэтага адбыліся выбары ў Вярхоўныя Советы саюзных рэспублік. Выбары далі савецкай уладзе 99,4 процанта ўсіх удзельнікаў галасавання. Паўстае пытанне, дзе-ж тут прызнакі «разлажэння» і чаму гэтае «разлажэнне» не сказалася на рэзультатах выбараў?

Слухаючы гэтых іншакраінных балбатуноў, можна прыйсці да вываду, што калі-б пакінулі на волі шпіёнаў, забойцаў і шкоднікаў і не перашкаджалі ім шкодзіць, забіваць і шпіёніць, то савецкія арганізацыі былі-б куды больш моцнымі і ўстойлівымі. **(Смех).** Ці не вельмі рана выдаюць сябе з галавой гэтыя паны, якія так нагла абараняюць шпіёнаў, забойцаў, шкоднікаў?

Ці не вярней будзе сказаць, што ачышчэнне савецкіх арганізацый ад шпіёнаў, забойцаў, шкоднікаў павінна было прывесці і сапраўды прывяло да далейшага ўмацавання гэтых арганізацый?

Аб чым гавораць, напрыклад, падзеі ля возера Хасан, як не аб тым, што ачышчэнне савецкіх арганізацый ад шпіёнаў і шкоднікаў з'яўляецца вярнейшым сродкам іх умацавання?

***

Задачы партыі ў галіне ўнутранай палітыкі:

1. Разгарнуць далей уздым нашай прамысловасці, рост прадукцыйнасці працы, удасканаленне тэхнікі вытворчасці з тым, каб, пасля таго, як перагналі ўжо галоўныя капіталістычныя краіны ў галіне тэхнікі вытворчасці і тэмпаў росту прамысловасці,—перагнаць іх таксама эканамічна на працягу бліжэйшых 10—15 год.

2. Разгарнуць далей уздым нашага земляробства і жывёлагадоўлі з тым, каб на працягу бліжэйшых 3—4 год дабіцца штогодняй вытворчасці зярна 8 мільярдаў пудоў з сярэдняй ураджайнасцю на гектар у 12—13 цэнтнераў, павялічыць вытворчасць па тэхнічных культурах на 30—35 процантаў у сярэднім, павялічыць пагалоўе авечак і свіней удвая, пагалоў'е буйнай рагатай жывёлы — процантаў на 40, пагалоў'е коней — процантаў на 35.

3. Прадаўжаць далей палепшанне матэрыяльнага і культурнага становішча рабочых, сялян, інтэлігенцыі.

4. Няўхільна праводзіць у жыццё нашу сацыялістычную Канстытуцыю, ажыццяўляць да канца дэмакратызацыю палітычнага жыцця краіны, умацоўваць маральна-палітычнае адзінства савецкага грамадства і дружаственае супрацоўніцтва рабочых, сялян, інтэлігенцыі, умацоўваць усямерна дружбу народаў СССР, развіваць і культывіраваць савецкі патрыятызм.

5. Не забываць аб капіталістычным акружэнні, памятаць, што замежная разведка будзе засылаць у нашу краіну шпіёнаў, забойцаў, шкоднікаў, памятаць аб гэтым і ўмацоўваць нашу сацыялістычную разведку, сістэматычна дапамагаючы ёй граміць і карчаваць ворагаў народа.

III.

ДАЛЕЙШАЕ ЎМАЦАВАННЕ ВКП(б)

З пункту гледжання палітычнай лініі і штодзённай практычнай работы справаздачны перыяд быў перыядам поўнай перамогі генеральнай лініі нашай партыі. **(Бурныя працяглыя апладысменты).**

Уцвярджэнне сацыялістычнай сістэмы ва ўсёй народнай гаспадарцы, завяршэнне рэканструкцыі прамысловасці і земляробства на аснове новай тэхнікі, датэрміновае выкананне другога пяцігадовага плана па прамысловасці, уздым штогодняй вытворчасці зярна да ўзроўню 7 мільярдаў пудоў, знішчэнне нішчаты і беспрацоўя і ўздым матэрыяльнага і культурнага становішча народа, — такія асноўныя дасягненні, якія дэманструюць правільнасць палітыкі нашай партыі, правільнасць яе кіраўніцтва.

Перад тварам гэтых грандыёзных дасягненняў праціўнікі генеральнай лініі нашай партыі, розныя там «левыя» і «правыя» плыні, усякія там трацкісцка-пятакоўскія і бухарынска-рыкаўскія перараджэнцы аказаліся вымушанымі змяцца ў камок, схаваць свае зацяганыя «платформы» і пайсці ў падполле. Не маючы мужнасці пакарыцца волі народа, яны палічылі за лепшае зліцца з меншавікамі, эсэрамі, фашыстамі, пайсці ва ўслужэнне да замежнай разведкі, наняцца ў шпіёны і абавязацца дапамагаць ворагам Савецкага Саюза расчляніць нашу краіну і аднавіць у ёй капіталістычнае рабства. Такі бясслаўны канец праціўнікаў лініі нашай партыі, стаўшых потым ворагамі народа.

Разграміўшы ворагаў народа і ачысціўшы ад перараджэнцаў партыйныя і савецкія арганізацыі, партыя стала яшчэ больш адзінай у сваёй палітычнай і арганізацыйнай рабоце, яна стала яшчэ больш згуртаванай вакол свайго Цэнтральнага Камітэта. **(Бурныя апладысменты. Усе дэлегаты ўстаюць і стоячы вітаюць дакладчыка. Воклічы: «Таварышу Сталіну ура! Няхай жыве таварыш Сталін! Няхай жыве ЦК нашай партыі! Ура!»)**

Разгледзім канкрэтныя даныя аб развіцці ўнутранага жыцця партыі, аб яе арганізацыйнай і прапагандысцкай рабоце за справаздачны перыяд.

1. Меры палепшання састава партыі. Разбуйненне арганізацый. Набліжэнне кіруючых органаў да нізавой работы

Умацаванне партыі і яе кіруючых органаў ажыццяўлялася за справаздачны перыяд у першую чаргу па двух лініях: па лініі рэгуліравання састава партыі, выцяснення ненадзейных і адбору лепшых, і па лініі разбуйнення арганізацый, змяншэння іх размераў і набліжэння кіруючых органаў да нізавой, аператыўнай, канкрэтнай работы.

На XVII з'ездзе партыі было прадстаўлена 1.874.488 членаў партыі. Калі параўнаць гэтыя даныя з данымі аб колькасці членаў партыі, прадстаўленых на папярэднім, XVI з'ездзе партыі, то атрымаецца, што за перыяд ад XVI з'езда партыі да XVII з'езда ў партыю прыбыла 600 тысяч новых членаў партыі. Партыя не магла не адчуць, што такі масавы наплыў у партыю ва ўмовах 1930—1933 гадоў з'яўляецца нездаровым і непажаданым пашырэннем яе састава. Партыя ведала, што ў яе рады ідуць не толькі чэсныя і адданыя, але і выпадковыя людзі, але і кар'ерысты, якія імкнуцца скарыстаць сцяг партыі ў сваіх асабістых мэтах. Партыя не магла не ведаць, што яна сільна не толькі колькасцю сваіх членаў, але, перш за ўсё, іх якасцю. У сувязі з гэтым устала пытанне аб рэгуліраванні састава партыі. Было рашана прадоўжыць чыстку членаў партыі і кандыдатаў, пачатую яшчэ ў 1933 годзе, і яна сапраўды была прадоўжана да мая 1935 года. Было рашана, далей, спыніць прыём у партыю новых членаў, і ён сапраўды быў спынен аж да верасня 1936 года, прычым прыём у партыю новых членаў быў адноўлен толькі 1 лістапада 1936 года. Далей, у сувязі са зладзейскім забойствам тав. Кірава, якое сведчыла аб тым, што ў партыі ёсць не мала падазроных элементаў, было рашана правесці праверку і абмен партыйных дакументаў, прычым тое і другое было закончана толькі к верасню 1936 года. Толькі пасля гэтага быў адкрыт прыём у партыю новых членаў і кандыдатаў. У рэзультаце ўсіх гэтых мерапрыемстваў партыя дабілася таго, што яна ачысціла свае рады ад выпадковых, пасіўных, кар'ерысцкіх і прама варожых элементаў, адабраўшы найбольш стойкіх і адданых людзей. Нельга сказаць, што чыстка была праведзена без сур'ёзных памылак. На жаль, памылак аказалася больш, чым можна было меркаваць. Несумненна, што нам не прыдзецца больш карыстацца метадам масавай чысткі. Але чыстка 1933—1936 гг. была ўсё-ж немінуча і яна ў асноўным дала станоўчыя рэзультаты. На гэтым XVIII з'ездзе прадстаўлена каля 1.600 тысяч членаў партыі, г. зн. на 270 тысяч членаў партыі менш, чым на XVII з'ездзе. Але ў гэтым няма нічога дрэннага. Наадварот, гэта — к лепшаму, бо партыя ўмацоўваецца тым, што ачышчае сябе ад скверны. Партыя ў нас цяпер некалькі меншая па колькасці яе членаў, але затое яна лепшая па якасці.

Гэта вялікае дасягненне.

Што датычыць палепшання штодзённага партыйнага кіраўніцтва ў сэнсе яго набліжэння да нізавой работы, у сэнсе яго далейшай канкрэтызацыі, то партыя прышла да таго вываду, што разбуйненне арганізацый, змяншэнне іх размераў з'яўляецца найлепшым сродкам для таго, каб аблягчыць партыйным органам кіраўніцтва гэтымі арганізацыямі, а само кіраўніцтва зрабіць канкрэтным, жывым, аператыўным. Разбуйненне ішло як па лініі наркаматаў, так і па лініі адміністрацыйна-тэрытарыяльных арганізацый, г. зн. па лініі саюзных рэспублік, краёў, абласцей, раёнаў і т. п. У рэзультаце прынятых мерапрыемстваў мы маем цяпер замест 7 саюзных рэспублік 11 саюзных рэспублік, замест 14 наркаматаў СССР 34 наркаматы, замест 70 краёў і абласцей 110 краёў і абласцей, замест 2.559 гарадскіх і сельскіх раёнаў 3.815. Адпаведна з гэтым у сістэме кіруючых органаў партыі ёсць цяпер 11 цэнтральных камітэтаў на чале з ЦК ВКП(б), 6 краявых камітэтаў, 104 абласных камітэты, 30 акруговых камітэтаў, 212 агульнагарадскіх камітэтаў, 336 гарадскіх раённых камітэтаў, 3.479 сельскіх раённых камітэтаў і 113.060 пярвічных партыйных арганізацый.

Нельга сказаць, што справа разбуйнення арганізацый ужо закончана. Вярней за ўсё, што разбуйненне пойдзе далей. Але, як-бы то ні было, яно ўжо дае свае добрыя рэзультаты як у адносінах палепшання штодзённага кіраўніцтва работай, так і ў адносінах набліжэння самога кіраўніцтва да нізавой канкрэтнай работы. Я ўжо не гавару аб тым, што разбуйненне арганізацый дало магчымасць вылучыць на кіруючую работу сотні і тысячы новых людзей.

Гэта таксама вялікае дасягненне.

2. Падбор кадраў, іх вылучэнне, іх расстаноўка

Рэгуліраванне састава партыі і набліжэнне кіруючых органаў да канкрэтнай нізавой работы не былі і не маглі быць адзіным сродкам далейшага ўмацавання партыі і яе кіраўніцтва. Другім сродкам умацавання партыі за справаздачны перыяд было карэннае палепшанне работы з кадрамі, палепшанне справы падбору кадраў, іх вылучэння, іх расстаноўкі, іх праверкі ў працэсе работы.

Кадры партыі — гэта каманданы састаў партыі, а паколькі наша партыя стаіць ва ўладзе, — яны з'яўляюцца таксама камандным саставам кіруючых дзяржаўных органаў. Пасля таго як выпрацавана правільная палітычная лінія, правераная на практыцы, кадры партыі становяцца рашаючай сілай партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва. Мець правільную палітычную лінію, — гэта, вядома, першая і самая важная справа. Але гэтага ўсё-ж недастаткова. Правільная палітычная лінія патрэбна не для дэкларацыі, а для правядзення ў жыццё. Але каб ператварыць у жыццё правільную палітычную лінію, патрэбны кадры, патрэбны людзі, разумеючыя палітычную лінію партыі, успрымаючыя яе, як сваю ўласную лінію, гатовыя правесці яе ў жыццё, умеючыя ажыццяўляць яе на практыцы і здольныя адказваць за яе, абараняць яе, змагацца за яе. Без гэтага правільная палітычная лінія рызыкуе астацца на паперы.

Тут іменна і ўстае пытанне аб правільным падборы кадраў, аб вырошчванні кадраў, аб вылучэнні новых людзей, аб правільнай расстаноўцы кадраў, аб іх праверцы па праробленай рабоце.

Што значыць правільна падбіраць кадры?

Правільна падбіраць кадры, гэта яшчэ не значыць набраць сабе замаў і помаў, скласці канцылярыю і выпускаць адтуль розныя ўказанні. **(Смех).** Гэта таксама не значыць злоўжываць сваёй уладаю, перакідваць без толку дзесяткі і сотні людзей з аднаго месца ў другое і назад і ўстрайваць бясконцыя «рэарганізацыі». **(Смех).**

Правільна падбіраць кадры гэта значыць:

Па-першае, цаніць кадры, як залаты фонд партыі і дзяржавы, даражыць імі, мець да іх павагу.

Па-другое, ведаць кадры, старанна вывучаць дастоінствы і недахопы кожнага кадравага работніка, ведаць, на якім пасту могуць лягчэй за ўсё разгарнуцца здольнасці работніка.

Па-трэцяе, клапатліва вырошчваць кадры, дапамагаць кожнаму растучаму работніку падняцца ўверх, не шкадаваць часу для таго, каб цярпліва «павазіцца» з такімі работнікамі і паскорыць іх рост.

Па-чацвертае, своечасова і смела вылучаць новыя, маладыя кадры, не даючы ім перастаяцца на старым месцы, не даючы ім закіснуць.

Па-пятае, расставіць работнікаў па пастах такім чынам, каб кожны работнік адчуваў сябе на месцы, каб кожны работнік мог даць нашай агульнай справе максімум таго, што наогул здолен ён даць па сваіх асабістых якасцях, каб агульны напрамак работы па расстаноўцы кадраў поўнасцю адпавядаў патрабаванням той палітычнай лініі, у імя правядзення якой робіцца гэтая расстаноўка.

Асаблівае значэнне мае тут пытанне аб смелым і своечасовым вылучэнні новых, маладых кадраў. Я думаю, што ў нашых людзей няма яшчэ поўнай яснасці ў гэтым пытанні. Адны лічаць, што пры падборы людзей трэба арыентыравацца, галоўным чынам, на старыя кадры. Другія, наадварот, думаюць арыентыравацца, галоўным чынам, на маладыя кадры. Мне здаецца, што памыляюцца і тыя і другія. Старыя кадры прадстаўляюць, вядома, вялікае багацце для партыі і дзяржавы. У іх ёсць тое, чаго няма ў маладых кадраў — велізарны вопыт па кіраўніцтву, марксісцка-ленінская прынцыпіяльная загартоўка, веданне справы, сіла арыентыроўкі. Але, па-першае, старых кадраў бывае заўсёды мала, менш, чым трэба, і яны ўжо часткова пачынаюць выходзіць са строю ў сілу натуральных законаў прыроды. Па-другое, у адной часткі старых кадраў бывае часам схільнасць упорна глядзець у мінулае, застраць на мінулым, застраць на старым і не заўважаць новага ў жыцці. Гэта называецца стратай пачуцця новага. Гэта вельмі сур'ёзны і небяспечны недахоп. Што датычыць маладых кадраў, то ў іх, вядома, няма таго вопыту, загартоўкі, ведання справы і сілы арыентыроўкі, якія маюць старыя кадры. Але, па-першае, маладыя кадры складаюць велізарную большасць, па-другое, яны маладыя, і ім не пагражае, пакуль-што, выхад са строю, па-трэцяе, у іх ёсць у ізбытку пачуццё новага, — каштоўная якасць кожнага бальшавіцкага работніка, і па-чацвертае, яны растуць і адукоўваюцца да таго быстра, яны пруць уверх да таго імкліва, што недалёк той час, калі яны дагоняць старыкоў, стануць побач з імі і будуць ім дастойнай зменай. Значыцца, задача заключаецца не ў тым, каб арыентыравацца альбо на старыя, альбо на новыя кадры, а ў тым, каб трымаць курс на спалучэнне, на з'яднанне старых і маладых кадраў у адным агульным аркестры кіруючай работы партыі і дзяржавы. **(Працяглыя апладысменты).**

Вось чаму неабходна своечасова і смела вылучаць маладыя кадры на кіруючыя пасты.

Адно з сур'ёзных дасягненняў партыі за справаздачны перыяд у справе ўмацавання партыйнага кіраўніцтва заключаецца ў тым, што яна з поспехам праводзіла знізу даверху гэты іменна курс на спалучэнне старых і маладых работнікаў у галіне падбору кадраў.

У Цэнтральным Камітэце партыі ёсць даныя, з якіх відаць, што за справаздачны перыяд партыя здолела вылучыць на кіруючыя пасты па дзяржаўнай і партыйнай лініі больш 500 тысяч маладых бальшавікоў, партыйных і прымыкаючых да партыі, з іх больш 20 процантаў жанчын.

У чым заключаецца цяпер задача?

Задача заключаецца ў тым, каб узяць поўнасцю ў адны рукі справу падбору кадраў знізу даверху і падняць яе на належную, навуковую, бальшавіцкую вышыню.

Для гэтага неабходна пакончыць з расшчапленнем справы вывучэння, вылучэння і падбору кадраў па розных аддзелах і сектарах, сканцэнтраваўшы яе ў адным месцы.

Такім месцам павінна быць Упраўленне кадраў у саставе ЦК ВКП(б) і адпаведны аддзел кадраў у саставе кожнай рэспубліканскай, краявой і абласной партарганізацыі.

3. Партыйная прапаганда. Марксісцка-ленінскае выхаванне членаў партыі і партыйных кадраў

Ёсць яшчэ адна галіна партыйнай работы, вельмі важная і вельмі адказная, па лініі якой ажыццяўлялася за справаздачны перыяд умацаванне партыі і яе кіруючых органаў,—гэта партыйная прапаганда і агітацыя, вусная і друкаваная, работа па выхаванню членаў партыі і кадраў партыі ў духу марксізма-ленінізма, работа па павышэнню палітычнага і тэарэтычнага ўзроўню партыі і яе работнікаў.

Наўрад ці ёсць неабходнасць многа гаварыць аб сур'ёзнейшым значэнні справы партыйнай прапаганды, справы марксісцка-ленінскага выхавання нашых работнікаў. Я маю на ўвазе не толькі работнікаў партыйнага апарата. Я маю на ўвазе таксама работнікаў комсамольскіх, прафсаюзных, гандлёва-кааперацыйных, гаспадарчых, савецкіх, асветніцкіх, ваенных і іншых арганізацый. Можна здавальняюча паставіць справу рэгуліравання састава партыі і набліжэння кіруючых органаў да нізавой работы; можна здавальняюча паставіць справу вылучэння кадраў, іх падбору, іх расстаноўкі; але калі пры ўсім гэтым пачынае чаму-небудзь кульгаць наша партыйная прапаганда, калі пачынае занепадаць справа марксісцка-ленінскага выхавання нашых кадраў, калі аслабявае наша работа па павышэнню палітычнага і тэарэтычнага ўзроўню гэтых кадраў, а самі кадры перастаюць у сувязі з гэтым цікавіцца перспектывай нашага руху ўперад, перастаюць разумець праваты нашай справы і ператвараюцца ў бесперспектыўных дзяляг, сляпа і механічна выконваючых указанні зверху, — то павінна абавязкова заняпасці ўся наша дзяржаўная і партыйная работа. Трэба прызнаць, як аксіому, што чым вышэй палітычны ўзровень і марксісцка-ленінская свядомасць работнікаў любой галіны дзяржаўнай і партыйнай работы, тым вышэй і пладатворней сама работа, тым эфектыўней рэзультаты работы, і наадварот, — чым ніжэй палітычны ўзровень і марксісцка-ленінская свядомасць работнікаў, тым больш магчымы зрывы і правалы ў рабоце, тым больш магчыма здрабненне і выраджэнне саміх работнікаў у дзяляг-крахабораў, тым больш магчыма іх перараджэнне. Можна з упэўненасцю сказаць, што, калі-б мы здолелі падрыхтаваць ідэалагічна нашы кадры ўсіх галін работы і загартаваць іх палітычна ў такой меры, каб яны маглі свабодна арыентыравацца ва ўнутранай і міжнароднай абстаноўцы, калі-б мы здолелі зрабіць іх зусім зрэлымі марксістамі-ленінцамі, здольнымі рашаць без сур'ёзных памылак пытанні кіраўніцтва краінай,— то мы мелі-б усе падставы лічыць дзевяць дзесятых усіх нашых пытанняў ужо вырашанымі. А рашыць гэтую задачу мы безумоўна можам, бо ў нас ёсць усе сродкі і магчымасці, неабходныя для таго, каб вырашыць яе.

Вырошчванне і фарміраванне маладых кадраў працякае ў нас звычайна па асобных галінах навукі і тэхнікі, па спецыяльнасцях. Гэта неабходна і мэтазгодна. Няма неабходнасці, каб спецыяліст-медык быў разам з тым спецыялістам па фізіцы або батаніцы і наадварот. Але ёсць адна галіна навукі, веданне якой павінна быць абавязковым для бальшавікоў усіх галін навукі, — гэта марксісцка-ленінская навука аб грамадстве, аб законах развіцця грамадства, аб законах развіцця пралетарскай рэвалюцыі, аб законах развіцця сацыялістычнага будаўніцтва, аб перамозе комунізма. Бо нельга лічыць сапраўдным ленінцам чалавека, які імянуе сябе ленінцам, але які замкнуўся ў сваю спецыяльнасць, замкнуўся, скажам, у матэматыку, батаніку або хімію і не бачыць нічога далей сваёй спецыяльнасці. Ленінец не можа быць толькі спецыялістам аблюбаванай ім галіны навукі, — ён павінен быць разам з тым палітыкам — грамадскім работнікам, які жыва цікавіцца лесам сваёй краіны, знаём з законамі грамадскага развіцця, умее карыстацца гэтымі законамі і імкнецца быць актыўным удзельнікам палітычнага кіраўніцтва краінай. Гэта будзе, вядома, дадатковай нагрузкай для бальшавікоў спецыялістаў. Але гэта будзе такая нагрузка, рэзультаты якой акупяцца з ліхвой.

Задача партыйнай прапаганды, задача марксісцка-ленінскага выхавання кадраў заключаецца ў тым, каб дапамагчы нашым кадрам усіх галін работы авалодаць марксісцка-ленінскай навукай аб законах развіцця грамадства.

Пытанне аб мерах палепшання справы прапаганды і марксісцка-ленінскага выхавання кадраў было прадметам неаднаразовага абмеркавання ЦК ВКП(б) з удзелам прапагандыстаў розных абласных партарганізацый. Быў улічан пры гэтым выхад у свет «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» у верасні 1938 года. Было ўстаноўлена, што выхад у свет «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» кладзе пачатак новаму размаху марксісцка-ленінскай прапаганды ў нашай краіне. Рэзультаты работ ЦК ВКП(б) апублікаваны ў вядомай яго пастанове «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Выходзячы з гэтай пастановы і ўлічваючы вядомыя рашэнні сакавіцкага пленума ЦК ВКП(б) у 1937 г. «Аб недахопах партыйнай работы», ЦК ВКП(б) намеціў наступныя галоўныя мерапрыемствы па ўстараненню недахопаў у галіне партыйнай прапаганды і палепшанню справы марксісцка-ленінскага выхавання членаў партыі і партыйных кадраў:

1. Сканцэнтраваць у адным месцы справу партыйнай прапаганды і агітацыі і аб'яднаць аддзелы прапаганды і агітацыі і аддзелы друку ў адзіным Упраўленні прапаганды і агітацыі ў саставе ЦК ВКП(б), з арганізацыяй адпаведнага аддзела прапаганды і агітацыі ў саставе кожнай рэспубліканскай, краявой і абласной партарганізацыі;

2. Прызнаючы няправільным захапленне гуртковай сістэмай прапаганды і лічачы больш мэтазгодным метад індывідуальнага вывучэння членамі партыі асноў марксізма-ленінізма, сканцэнтраваць увагу партыі на прапагандзе ў друку і арганізацыі лекцыйнай сістэмы прапаганды;

3. Арганізаваць у кожным абласным цэнтры аднагадовыя курсы перападрыхтоўкі для нізавога звяна нашых кадраў;

4. Арганізаваць у радзе цэнтраў нашай краіны двухгадовую ленінскую школу для сярэдняга звяна нашых кадраў;

5. Арганізаваць Вышэйшую школу марксізма-ленінізма пры ЦК ВКП(б) з трохгадовым курсам для падрыхтоўкі кваліфікаваных тэарэтычных кадраў партыі;

6. Стварыць у радзе цэнтраў нашай краіны аднагадовыя курсы перападрыхтоўкі прапагандыстаў і газетных работнікаў;

7. Стварыць пры Вышэйшай школе марксізма-ленінізма шасцімесячныя курсы для перападрыхтоўкі выкладчыкаў марксізма-ленінізма ў ВНУ.

Няма сумнення, што ажыццяўленне гэтых мерапрыемстваў, якія ўжо праводзяцца, але яшчэ не праведзены ў дастатковай меры, зараз-жа дасць свае добрыя рэзультаты.

(Працяг даклада ў наступным нумары).

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка, Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Т—937.